Алег Сівагракаў

# 100 крокаў да ўстойлівага развіцця нашага мястэчка

## Нататкі для эксперта, актывіста мясцовай супольнасці, дэпутата, мэра

Кніга выдадзена ў рамках праграмы "Школа мэраў"
АДУ "Цэнтр даследавання грамадскага кіравання "СІМПА"
і грамадскай культурніцкай кампаніі "Будзьма беларусамі"

## Ад аўтара



Вітаю, паважаны чытач!

Выданне, што Вы трымаеце ў руках – вынік маёй шматгадовай працы ў рэчышчы ўстойлівага развіцця на рэгіянальным і мясцовым узроўні – у абласцях і раёнах, гарадах і вёсках, мікрараёнах і школах, у Беларусі і за мяжой. Мэта выдання – дапамагчы новым (а можа і ўжо дасведчаным) удзельнікам мясцовага развіцця (дэпутатам і супрацоўнікам выканкамаў, прадстаўнікам недзяржаўных арганізацый і мясцовым актывістам, жанчынам і мужчынам, пажылым і моладзі) у распрацоўцы і рэалізацыі мерапрыемстваў, накіраваных на ўстойлівае развіццё Вашых тэрыторый і Вашых супольнасцяў.

Мне падабаецца гістарычная назва “мястэчка”, вартае сучаснага адраджэння. У гэтым слове гучыць нешта пяшчотнае ў адносінах да свайго кутка зямлі і адначасова ў ім чуваць моц нашых месцаў, іх гісторыя і традыцыі. Таму ў кніжцы выкарыстоўваецца абагульненая назва населенага пункта – Мястэчка. Яно і рэальнае, і прыдуманае. Часам вельмі простае, а часам – ідэальнае, хутчэй, з будучыні. Але ў любым выпадку наша Мястэчка – гэта там, дзе мы жывём, працуем, адпачываем. Гэта наш горад, раён, вёска, двор. Гэта тое, што мы любім, аб чым сумуем у вандроўках, чым ганарымся. Мы хочам, каб наша Мястэчка квітнела, і актыўна працуем дзеля гэтага.

І каб крыху палегчыць гэгую працу, тут сабраныя прыклады і парады пра тое, што канкрэтна можа зрабіць неабыякавы чалавек, а яшчэ лепш – талака, у якую аб’яднаюцца жыхары, грамадскія арганізацыі, бізнес і ўлада.

Успрымайце тэкст творча. Напрыклад, там, дзе ў тэксце мы распавядаем пра музей, можна на яго месца паставіць тэатр ці мастацкую галерэю… Напамін пра нейкі канкрэтны бізнес можа стаць каталізатарам для зусім іншай прадпрымальніцкай ідэі…

Многа дзе ў канцы сказаў Вы сустрэнеце многакроп’е (…). Гэта азначае, што мы спынілі пералік, які можна працягваць і папаўняць. З гэтай мэтай ў нізе старонак мы

пакінулі месца для дадатковых асабістых нататкаў кожнага з Вас. Будзем вельмі ўдзячнымі, калі Вы дашлеце свае прапановы нам, і мы ўключым іх у наступнае выданне кніжкі.

Некаторыя з нататкаў было цяжка аднесці да таго ці іншага параграфа кніжкі, маючы на ўвазе магчымыя рознабаковыя аспекты дзеяў, разнастайныя эфекты і характарыстыкі. Не судзіце за гэта строга.

Няпроста і задаволіць кожнага формай падачы матэрыялу. Адным падабаюцца канкрэтныя парады, іншыя хочуць зрабіць самастойныя высновы з апісання вопыта другіх. Нехта любіць учытацца ў дробязі, другі – паглядзець на малюнак. Таму мы паспрабавалі задаволіць нашай працай найбольшую, на наш погляд, аўдыторыю, скамбінаваўшы гэтыя падыходы.

Нататкі стаяць не па прыярытэтам і значнасці, бо менавіта ў час Вашай працы па мясцовым развіцці на падставе вашых калектыўных абмеркаванняў і парад экспертаў могуць высветліцца гэтыя прыярытэты.

100 крокаў – не так многа, але і не так мала. І калі мы будзем рабіць па 100 такіх крокаў кожны год, а можа і кожны месяц, а можа і часцей, то наш рух стане адчувальным.

Прадстаўнікі Дзісны і Моталя, Жалудка і Косава, Смілавіч і Перабродздзя, Орлі і Камарова, Здзітава і Відамлі, Клясціц і Зэльвы… (пералік можна працягваць) знойдуць у рысах нашага Мястэчка свае рысы.

Адначасова і нашы замежныя калегі з вёсак Зямлі Паўночны Рэйн Вестфалія, польскіх гмін з-пад Кракава, літоўскіх аграсядзіб ля Коўны і латышскагаЛіванскага краю, балгарскіх абшчын у горных раёнах ля мяжы з Грэцыяй, вёсак Горынг і Стрытлі, што ля Оксфарда ў Англіі… могуць заўважыць, што гаворка ідзе пра іх.

А яшчэ мы будзем пастунова ўводзіць некаторыя новыя тэрміны, таму што гэта будзе дапамагаць Вам размаўляць на адной мове з калегамі і экспертамі, іншаземнымі партнёрамі і “прасунутымі” маладзёнамі…

Невядома, а можа пройдуць гады, дзесяцігоддзі і вякі і сучасныя велізарныя гарады знікнуць, а жыццё ізноў будзе віраваць у невялікіх мястэчках… І мы ўжо зараз можам пачаць рыхтавацца да гэтага…

*Алег Сівагракаў*

Прынцыпы ўстойлівага развіцця
(і адначасова часткі нататніка):

1. Арыентацыя на бачанне жадаемай будучыні
2. Сістэмнасць / Комплекснасць
3. Прыродаахоўны імператыў
4. Мясцовыя рэсурсы
5. Партнёрства
6. Разнастайнасць
7. Інавацыі
8. Эфектыўнасць
9. Інстытуцыйны падмурак
10. Мы самі! (Субсідыярнасць)

**Змест**


I. Арыентацыя на бачанне жадаемай будучыні
  1. Улічваць інтарэсы нашчадкаў
  2. Прывабны імідж
  3. Мода на ўстойлівае развіццё
  4. Інфармацыйная актыўнасць
  5. Празрыстасць планаў і дзеянняў
  6. Вучыцца дзеля ўстойлівай будучыні
  7. Малапавярховыя дамы
  8. Цэнтральная плошча
  9. Водныя артэрыі
  10. Дзіцячыя погляды

II. Комплекснасць / Сістэмнасць
  11. Праекты
  12. Прадухіліць праблемы
  13. Шматфункцыянальнасць
  14. Сувязі і ўзаемны ўплыў
  15. Анлайн-інструменты дзеля сістэмнасці
  16. Альтэрнатыўныя рашэнні
  17. Міждысцыплінарнасць (міжсектарнасць)
  18. Шматфункцыянальны абшчынны цэнтр
  19. Трымацца прынятых стратэгічных арыенціраў
  20. Маладзёжная стратэгія

III. Прыродаахоўны імператыў
  21. Прынцып прадасцярогі
  22. Зберагаем рэсурсы – захоўваем прыроду
  23. Адходы – ў даходы
  24. Прырода-сяброўская мабільнасць
  25. Зялёная інфраструктура
  26. Увага да канкрэтнага
  27. Гарадскі парк
  28. Прадметы сілы
  29. Устойлівыя закупкі
  30. Старыя сады

IV. Мясцовыя рэсурсы
  31. Гісторыя
  32. Нашы перавагі
  33. Заметнае месца
  34. Прапануем будынкі і пляцоўкі
  35. Мясцовыя разынкі (самае-самае!)
  36. Крэатыўны падыход
  37. Патэнцыял сімвалаў
  38. Візуалізацыя

39. Падтрымка бізнесу
40. Сацыяльны капітал

V. Партнёрства
41. Грамадская супольнасць
42. Каардынацыя
43. Пабрацімства
44. Прызнанне заслуг
45. Землякі
46. Міністэрствы, дэпутаты Парламента
47. Краіны і іх амбасады
48. Магчымасці Інтэрнэта
49. Пляцоўкі для зносін
50. Лідэрства

VI. Разнастайнасць
51. Дыверсіфікацыя эканомікі
52. Традыцыі
53. Рамёствы
54. Розныя людзі
55. На вялікую сцэну
56. Рэклама
57. Брэндзінг
58. Музей-клуб з унікальнымі экспанатамі
59. Погляд звонку
60. Выкарыстанне SWOT-аналізу

VII. Інавацыі
61. “Разумнае мястэчка”
62. Вучымся – даследуем – укараняем
63. Сябруем з экспертамі
64. Конкурсы і спаборніцтвы
65. Аграэкатурызм
66. Прыцягнуць адукацыю і навуку
67. Лепш пабачыць
68. Забытае старое
69. Мястэчказнаўства
70. Глядзім наперад

VIII. Эфектыўнасць
71. Прыярытэты
72. Замкнутыя цыклы
73. Інвентарызацыя і рэалізацыя нерухомасці
74. Конкурсы і тэндэры
75. Стымулы
76. Індыкатары
77. Аналіз і пратакол
78. Кааперацыя і кластэры

79. Малыя справы
80. Поспех

IX. Інстытуцыйны падмурак

81. Стратэгічны падыход
82. Статут Мястэчка
83. Нарматыўная база
84. Суседнія супольнасці
85. Дзень Мястэчка
86. Валанцёры
87. Грамадскі савет па ўстойлівым развіцці
88. Тэматычныя рабочыя групы
89. Новыя завядзёнкі
90. Летапіс Мястэчка

X. Мы – самі! (Субсідыярнасць)

91. Пачынаем з сябе
92. Мы – піянеры!
93. “Вы самі можаце гэта зрабіць”
94. Газета – сімвал самастойнасці
95. Пачынаем з простага
96. Нашы магчымасці – галоўны рэсурс развіцця
97. Нікога не пакінем збоку
98. Сацыяльныя прадпрыемствы
99. Недзяржаўныя некамерцыйныя арганізацыі
100. Не губляць час, пачынаць дзейнічаць

## I. Арыентацыя на бачанне жадаемай будучыні

Вызначэнне з вобразам жадаемай будучыні для нашага мястэчка было адным з першых крокаў на шляху развіцця.

“Памятайце, — нагадалі нам эксперты мудры афарызм Сенэкі. — Караблю, які не ведае, куды яму ісці, няма папутнага ветру”. І мы даволі працяглы час разам працавалі над нашым бачаннем таго, якім наша Мястэчка павінна быць праз 7-10-15 год. Сыходзячы з бачання мы распрацавалі прыярытэты стратэгіі, а потым — канкрэтныя мерапрыемствы па іх дасягненні. Гэта дазволіла сканцэнтраваць высілкі і рэсурсы на галоўных напрамках нашай работы.

### 1. Улічваць інтарэсы нашчадкаў

Гэта — важны арыенцір у канцэпцыі ўстойлівага развіцця. Сённяшнія стратэгіі і планы ў будучым стануць канкрэтнымі дзеяннямі, а іх вынікі ўбачаць і адчуюць нашы дзеці і ўнукі. Добрыя ўмовы жыцця, квітнеючая прырода, прыязныя сацыяльныя адносіны паміж жыхарамі, магчымасці для творчай працы і прыемнага адпачынку, перспектывы адукацыі і асабістай рэалізацыі — гэта важкія кампаненты той спадчыны, якую мы можам пакінуць сваім нашчадкам.

Помніць аб неабходнасці ўлічваць інтарэсы будучых пакаленняў і ў стратэгіях, і ў кожнадзённай працы дапамагае нам галерэя малюнкаў дзяцей “Наша Мястэчка сёння і заўтра”. Галерэя месціцца ў Доме культуры, яна час ад часу абнаўляецца і даступная для наведвальнікаў.



## 2. Прывабны імідж

Мы ствараем і прапагандуем зразумелыя ўсім лозунгі нашых мясцін: “Горад А — горад, дзе добра жыць!”, “Мястэчка Б — гэта крута!”, “Вёска В — наперад!”, “Горад Г — гэта эліта!”… Адначасова мы фарміруем прывабны імідж і рэпутацыю нашага края як бяспечнай, карыснай для здароўя і перспектыўнай для жыцця і працы мясціны. Аснова гэтага — шчыры гонар нашых жыхароў за свой край і канкрэтныя справы дзеля яго развіцця.



## 3. Мода на ўстойлівае развіццё

Ўстойлівае развіццё — модная з’ява ў нашым мястэчку.

“Мы — ў трэндзе!”, — кажуць нашы падлеткі, калі вывучаюць гісторыю мястэчка і біяразнастайнасць нашых лясоў і балот…

“Па-першае, звяртай ўвагу на экалагічнасць і эканамічнасць рухавіка”, — раюць уладары прыватных аўто адзін аднаму...

“Мы самі пашылі традыцыйныя сукенкі для фэста, ўзяўшы даматканыя тканіны з бабулевых куфэркаў”, — распавядаюць нашы красуні…

“Я збярог кожны стары цвік у дзедавай хаце, калі рэстаўраваў яе. Зараз гэта — мая гордасць, жывы музей, куды просяцца зайсці турысты”, — дзеліцца сакрэтамі малады гаспадар…

“У гэтым годзе я не выкінула ў агульную сметніцу нічога. Усё смецце было раздзелена і асобна здадзена. А многае пайшло ў кампост — і зараз у мяне файнае ўгнаенне для сада”, — расказвае гаспадыня…



### 4. Інфармацыйная актыўнасць

Мы выкарыстоўваем традыцыйныя і новыя сучасныя метады інфармацыйнага ўплыву, сродкі масавай інфармацыі ўсіх відаў і ўзроўняў (гарадскую, раённую, абласную, рэспубліканскую прэсу, радыё, тэлебачанне, дошкі аб’яваў і ўлёткі, сайт і сацыяльныя сеткі), каб адлюстраваць нашу працу, поспехі і здзяйсненні. Мы запрашаем журналістаў у нашы гарады з розных нагодаў, рыхтуем для іх цікавыя прэс-рэлізы, інфармацыю. Кожны з нас (супрацоўнікі мэрыі, сябры НГА, дэпутаты, кіраўнікі Грамадскіх Радаў) рэгулярна выступае, піша артыкулы, ладзіць прэзентацыі аб цікавых падзеях, дасылае нататкі ў СМІ, ўдзельнічае ў стварэнні фільмаў… і заўсёды мае ў сваім партфелі, заплечніку, сумачцы ці кішэні буклеты пра наша Мястэчка, “местачковую візітоўку” і прэзентацыю аб нашым краі і аб тым, што тут робіцца дзеля ўстойлівага развіцця. У нас створаны сайт, нашы сябры і калегі актыўна ўдзельнічаюць у форумах у Інтэрнэце.



**5. Празрыстасць планаў і дзеянняў**

Мы забяспечваем празрыстасць у працы мясцовай ўлады і грамадзянскіх структур, выкарыстоўваем сродкі масавай інфармацыі, стэнды, інфармацыйныя дні, выпускаем мясцовы бюлетэнь. Гэта павышае давер да нашай працы з боку жыхароў, а таксама спрыяе пашырэнню ўдзелу ў справах па ўстойліваму развіццю нашага Мястэчка.



## 6. Вучыцца дзеля ўстойлівай будучыні

Гэта важкі кампанент сённяшніх дзей і адначасова падмурак для ўстойлівасці ў стратэгічнай перспектыве. Таму мы заўсёды шукаем магчымасці вучыцца самім і павышаць кваліфікацыю і адукацыйны ўзровень усяго насельніцтва нашага Мястэчка. Мы стварылі спецыяльную ініцыятыўную групу “Вучымся дзеля ўстойлівага развіцця” на базе нашай школы. Яна ўсталявала кантакты з беларускімі і замежнымі арганізацыямі (дзяржаўнымі і грамадскімі), якія дапамагаюць нам у рэалізацыі адукацыйных праграм. Можна ствараць аналагічныя гурткі, народныя школы. Асаблівую ўвагу пры гэтым звяртаем на дзяцей і моладзь. Іх выхаванню і адукацыі – асобы клопат! Мы пачынаем вучыць правілам устойлівага развіцця нашых дзяцей з самага маленства, з першых крокаў, з першых заняткаў у дзіцячым садку.



## 7. Малапавярховыя дамы

Наша Мястэчка выглядае ўтульным і прывабным для жыцця і працы ў тым ліку і таму, што мы зрабілі арыенцір на малапавярховыя дамы. Гэта галоўным чынам — аднапавярховыя індывідуальныя дамы. Такая забудова спалучае камфорт, кантакт з прыродай, пачуццё "радавога гнязда". У такіх умовах больш магчымасцей для самарэалізацыі, перспектыў, хоббі, кантактаў. Нават таннае сацыяльнае жытло мы стараемся будаваць у падобным стылі: злучаныя адна з другой двухпавярховыя секцыі, дзе кожны ўласнік або арандатар мае свой выхад на вуліцу, магчымасць прыбудаваць гараж, зрабіць невялічкі гародзік, пляцовачку для дзяцей… Аднойчы японская дэлегацыя, якую (з гонарам!) павезлі глядзець адзін з мікрараёнаў аднаго абласнога цэнтра, ўбачыўшы шматпавярховыя панэльныя дамы, спыталіся: "А навошта вам столькі часовага жылля?".



## 8. Цэнтральная плошча

На жаль, нам не пашанцавала зберагчы аутэнтычную забудову цэнтра нашага Мястэчка. Але, гледзячы наперад, мы плануем адбудаваць цэнтральную плошчу “як было”: двух-трохпавярховыя будынкі, дзе на першых паверхах — разнастайныя крамкі і сэрвісы. Тут — кавярні і цырульні, аптэка і камп’ютэрны цэнтр, міні-пякарня і прыватны броварчык. Побач – банк і бібліятэка, фотаатэлье і агенцтва нерухомасці, турыстычны цэнтр і сувенірная крамка. Другі і трэці паверхі — гатэлікі ці кватэры гаспадароў. Першым крокам да такога праекта, мы мяркуем, будзе конкурс сярод маладых архітэктараў. Магчыма, конкурс міжнародны.

А калі інвестары прапанавалі нам пабудаваць супермаркет на ўскрайку Мястэчка, ля аўтамабільнай шашы, то мы прапанавалі ім іншае месца — бліжэй да цэнтра, каб жыццё віравала тут і побач з вялікім гандлёвым аб’ектам развіваўся наш малы і сярэдні бізнес.



## 9. Водныя артэрыі

Амаль у кожным мястэчку нашай краіны ёсць ці рэчка, ці рачулка, ці возера, ці сажалка… Яны могуць адыграць важную ролю ў станаўленні пазітыўнага іміджу нашай тэрыторыі. Мы праводзім работу па добраўпарадкаванню берага рэчкі, ачысцілі ручайкі і крынічкі, узнавілі плаціны, плануем рэканструяваць сістэму сажалак. Актыўную ролю ў гэтай працы адыгрываюць школьнікі разам з прыродаахоўчай грамадскай арганізацыяй. Сфатаграфавацца на беразе нашай рэчкі стала папулярным нават сярод маладых падчас вяселля.



## 10. Дзіцячыя погляды

Мы арганізавалі апытанне школьнікаў па тэме: “Якім вы хочаце бачыць наша Мястэчка ў будучым? Што б вы параілі зрабіць нашаму мэру для паляпшэння жыцця насельніцтва?”. Акрамя таго нашы школьнікі напісалі сачыненні па гэтым тэмам. Мы правялі конкурсы дзіцячых малюнкаў. Усё гэта можа адначасова натхніць дарослых і стаць важкім аргументам для падтрымкі руху да пераменаў. Малюнкамі можна аздобіць выданне вашай мясцовай стратэгіі ўстойлівага развіцця.



## II. Комплекснасць / Сістэмнасць

Патрабаванне комплекснага, сістэмнага падыходу – важны прынцып устойлівага развіцця. Дзякуючы такому правілу наша Мястэчка будуецца і добраўпарадкоўваецца не хаатычна, а згодна са стратэгіяй, дзе збалансаваныя прыродныя, сацыяльныя і эканамічныя аспекты развіцця.

### 11. Праекты

Мы удзельнічаем (самастойна ці ў партнёрстве з іншымі арганізацыямі) у мясцовых, рэгіянальных, нацыянальных і міжнародных праектах рознай накіраванасці і намагаемся, каб пры гэтым развіваліся адначасова ўсе накірункі нашай стратэгіі: сацыяльны, эканамічны і прыродаахоўны.



## 12. Прадухіліць праблемы

Сістэмны падыход арыентуе на тое, каб канцэнтраваць намаганні на прафілактыцы і прадухіленні праблем, а не на барацьбе з іх вынікамі. Як гавораць, “хваробу лягчэй прадухіліць…” Так, укладанні на карысць дашкольнага выхавання і адукацыі дазваляць у будучым зменшыць затраты на міліцыю і турмы.



## 13. Шматфункцыянальнасць

Шматфункцыянальнасць — гэта калі кожны элемент выконвае некалькі функцый і кожная функцыя рэалізуецца некалькімі элементамі.

Так, намаляваныя з удзелам нашых школьнікаў артаб’екты на сценах дамоў (муралы, графіці) адначасова ўпрыгожваюць вуліцу, выконваюць адукацыйную функцыю (бо на іх могуць быць “чырвонакніжныя” віды жывёл ці гістарычныя падзеі), а таксама спрыяюць прасоўванню мясцовага брэнда. У лаўкі на нашай цэнтральнай плошчы ўбудаваныя і свяцільнікі (што дазволіла скараціць выдаткі на дадатковыя стаўбы). Старое дрэва на плошчы — дом для разнастайных птушак і насякомых, а таксама яно дае цень людзям у спёку, паляпшае якасць паветра, і яно вельмі прыгожае.



## 14. Сувязі і ўзаемны ўплыў

Узаемная сувязь і ўзаемны ўплыў: усе элементы звязаныя паміж сабой і пазітыўна ўплываюць адзін на другі.

Так, мы пастараліся, каб розныя часткі нашай стратэгіі ўстойлівага развіцця былі цесна звязаныя паміж сабой. Ад гэтага мы чакаем так званы сінэргетычны эфект. Наш архітэктар сочыць, каб архітэктурны стыль нашага Мястэчка станавіўся “фірмовым” – асаблівым, каларытным. Для гэтага прад’яўляюцца патрабаванні да вонкавага выгляду будынкаў. Мы прыглядаемся да канцэпцыі “суместнага горада” (“collaborative town”), у якім спалучаюцца сацыяльныя праекты і горадабудаўнічыя інавацыі, аб’ядноўваюцца ідэі і мерапрыемствы розных прадстаўнікоў мясцовай супольнасці.



## 15. Анлайн-інструменты дзеля сістэмнасці

Мы вывучаем магчымасці выкарыстання анлайн-інструментаў для развіцця мясцовай супольнасці і вырашэння праблем Мястэчка. Пачынаць мы вырашылі са стварэння інтэрактыўных мап па розных накірунках: рэестр і зберажэнне старых дрэваў, вела-інфраструктура, адрасы пунктаў па збору выкідаў (другасных рэсурсаў) для перапрацоўкі. У перспектыве – планы па стварэнню мапы чысціні паветра, наяўнасці працоўных месцаў і г.д. Адначасова мы ствараем магчымасці для анлайн-кансультацый па ўсіх напрамках развіцця мястэчка. Быць анлайн-экспертамі-валанцёрамі пагадзіліся ўжо некалькі дзесяткаў чалавек.



## 16. Альтэрнатыўныя рашэнні

Падчас сістэмнага аналізу і пошука шляхоў для развіцця і рашэння праблем важна звяртаць увагу на магчымаць альтэрнатыў традыцыйным падыходам. Так, калі разглядаем планы мабільнасці, мы ў першую чаргу шукаем магчымасць нетранспартнага шляху вырашэння пытанняў. Замест нятаннага транспартнага будаўніцтва можна проста перанесці нейкі гандлёвы аб’ект бліжэй да людзей. Выкарыстанне новых тэхналогій зберажэння цяпла і энергіі можа вызваліць нас ад патрэбы ствараць новыя энергетычныя магутнасці. Альтэрнатывай для грашовай падтрымкі беспрацоўных можа стаць выдаткаванне сродкаў на пераадукацыю ці на стварэнне новых працоўных месцаў.



## 17. Міждысцыплінарнасць (міжсектарнасць)

Дамагчыся сістэмнага падыходу дапаможа запрашэнне да сумеснай працы над стратэгіяй устойлівага развіцця і да ўдзелу ў яе мерапрыемствах шырокага кола спецыялістаў розных прафесій і спецыялізацый. У наш Экспертны савет аб’ядналіся архітэктар і бізнесмен, настаўніца і доктар, гісторык і фізік, пенсіянер-краявед і малады камп’ютэршчык, супрацоўнік выканкома і прадстаўнік НДА. Гэта дазваляе атрымаць шэраг розных поглядаў на адну і тую ж праблему, прыняць да ўліку многія фактары, павысіць аргументаванасць прынятых рашэнняў.



## 18. Шматфункцыянальны абшчынны цэнтр

Пакуль мы толькі марым пра гэта. Мы плануем пабудаваць такі цэнтр ці зрабіць яго на базе нейкай былой установы (дома быта, былой бібліятэкі?). Мэта — сабраць разам, у адным будынку, патрэбныя нашым жыхарам сервісы і заняткі. Каб там праводзіліся заняткі спортам, а ў суседнім пакоі праводзілі пасяджэнні Клуб па краязнаўству ці Літаратурная гасцёўня. Каб вялікая зала магла трансфармавацца: з раніцы ў суботу там можна было б ладзіць кірмашы прадукцыі мясцовых фермераў, з абеду — лекцыі ці канцэрты, а ўвечары — маладзёжную вечарыну. Так мы не толькі зменшым выдаткі на ўтрыманне будынка, але такі фармат будзе спрыяць гуртаванню жыхароў, умацаванню супольнасці. Прыклады такіх "абшчынных дамоў" мы бачылі ў Англіі, Галандыі, Нямеччыне.



## 19. Трымацца прынятых стратэгічных арыенціраў

Адна з пагроз на шляху каманды “пераменаў да ўстойлівасці” — гэта збочыць ад выбранага стратэгічнага напрамку. Каб пазбегнуць гэтага, мы ўважліва кантралюем, каб нашы мерапрыемствы былі звязаныя з доўгатэрміновымі індыкатарамі; а індыкатары, у сваю чаргу, павінны адлюстроўваць прыярытэты; прыярытэты ж павінны арыентавацца на выяву пажаданай будучыні (візію). Такая сувязь, своеасаблівы ланцужок, забяспечвае сістэмнасць у працы, дапамагае не збіцца з дарогі.



## 20. Маладзёжная стратэгія

Моладзь нашага мястэчка распрацавала сваю "Маладзёжную стратэгію ўстойлівага развіцця Мястэчка", у якой яны больш дэталёва апісалі сітуацыю з пункту гледжання дзяцей і моладзі, дадалі свае ідэі ў агульны вобраз жадаемай будучыні і прыярытэты. Тут сфарміраваны таксама комплекс мерапрыемстваў для дзяцей і моладзі і з іх удзелам. Такім чынам створаны "мосцік" паміж пакаленнямі для сумеснай працы ў рэчышчы ўстойлівага развіцця.



## III. Прыродаахоўны імператыў

### 21. Прынцып прадасцярогі

Калі немагчыма разлічыць негатыўныя ўздзеянні некаторых планаў і праектаў на чалавека і прыроду, мае сэнс не спяшацца з іх рэалізацыяй. Пры ўзнікненні сумненняў — ці будзе такая тэхналогія бяспечнай — трэба дамагацца навуковых доказаў, абгрунтаванняў. Неасцярожныя дзеянні могуць прычыніць непапраўную шкоду. Глыбей аналізуйце такія пытанні.



## 22. Зберагаем рэсурсы – захоўваем прыроду

У нашым горадзе распрацавана і рэалізуецца “Праграма рацыянальнага расходвання рэсурсаў”, у межах якой вытворчасць і сфера паслуг бяруць арыенцір на энергазберагаючую санацыю будынкаў, мясцовыя аднаўляемыя крыніцы энергіі, выкарыстанне сонечнай і ветравой энергіі, біягазавыя станцыі, выкарыстанне дажджавой вады. Насельніцтву аказваецца падтрымка ва ўстаноўцы прыбораў індывідуальнага ўліку вады, цяпла і газу, цеплавой санацыі будынкаў і іншых рэсурсазберагальных тэхналогій. Наш арыенцір — мадэль біяэнергічнага паселішча.



## 23. Адходы — ў даходы

Важнай часткай стратэгіі ўстойлівага развіцця нашага мястэчка з'яўляецца "План кіравання выкідамі", ў межах якога арганізаваны раздзельны збор выкідаў, іх складаванне і перапрацоўка. Мы дамовіліся з бліжэйшай аўтазаправачнай станцыяй, каб туды прымалі скарыстаныя фільтры і масла для наступнай перапрацоўкі. На прысядзібных і прышкольных участках распаўсюджана практыка кампаставання арганічных выкідаў — самы экалагічны і эканамічны шлях змяншэння забруджвання навакольнага асяроддзя. Курыруе гэтую праграму мясцовая прыродаахоўная арганізацыя разам са школай.



## 24. Прырода-сяброўская мабільнасць

Мы стараемся забяспечваць даступнасць сацыяльных аб’ектаў у межах нашага горада, арыентуючыся на прыярытэтнасць (у напрамку змяншэння) пешаходаў — веласіпедыстаў (коннікаў) — грамадскага транспарту — асабістага аўтатранспарту. Дзеля гэтага ствараюцца зручныя ўмовы для хады пешшу ва ўсе сезоны года, будуюцца аптымальна спланаваныя веладарожкі і маршруты грамадскага транспарту, уводзяцца абмежаванні на ўезд аўтамабіляў у цэнтр горада, ствараюцца пешаходныя зоны, бульвары, стаянкі для ровараў, добраўпарадкаваюцца набярэжныя для шпацыру.



## 25. Зялёная інфраструктура

Выкарыстанне такога тэрміну і праца ў гэтым накірунку даюць магчымасць у некаторай ступені пераадолець існуючы стэрэатып большай важнасці “эканамічнага” ў параўнанні з “сацыяльным” і “прыродным”. Шырока распаўсюджаны тэрміны “вытворчая інфраструктура”, “транспартная інфраструктура”. Таму і “зялёная інфраструктура” гучыць для некага як нешта больш важнае, чым, напрыклад, проста “зялёныя насаджэнні”. А па сутнасці — гэта сістэма прыродных аб’ектаў (паркаў, алей, адзінкавых дрэваў, хмызнякоў уздоўж рэчак, зялёных лужкоў), аб’яднаных паміж сабой і забяспечваючых прыроднае напаўненне гарадскога асяроддзя. З дапамогай архітэктараў і ландшафтных дызайнераў мы спланавалі ў нашым Мястэчку стварэнне зялёных калідораў, зялёных загароджаў. Прамысловыя прадпрыемствы стварылі зялёныя паясы вакол раёнаў вытворчасці. Мы прадугледжваем зялёныя калідоры пры новым будаўніцтве.



## 26. Увага да канкрэтнага

У працы па ўстойлівым развіцці тэрыторыі трэба надаваць увагу і агульнаму (стратэгіі, планы), і канкрэтнаму. Так, напрыклад, зберажэнне прыгожага старога дрэва не пройдзе незаўважаным для большасці жыхароў і гасцей і адначасова паспрыяе зберажэнню біяразнастайнасці. Агароджаны мурашнік, дагледжаная крынічка, сажалка з некранутым прыродным акружэннем, птушыныя домікі (а ў Нямеччыне мы бачылі нават “домікі” для насякомых!) могуць стаць тымі знакамі, якія будуць нагадваць аб неабходнасці зберагаць прыроду. Тое ж самае тычыцца аднаўлення парушаных тэрыторый, пусткаў, расчыстак несанкцыянаваных звалак…



## 27. Гарадскі парк

Яго ўпарадкаванне таксама трэба праводзіць з думкамі пра жывую прыроду і біяразнастайнасць. У нашым парку ёсць старыя, падсохлыя дрэвы, дзе сталуюцца многія віды птушак. Ёсць тэрыторыі, дзе мы не косім траву, каб даць магчымасць паспець насенню так званага “пустазелля”, сярод якога — важныя элементы розных экасістэмных ланцужкоў… Шэфства над паркам — справа нашага валанцёрскага клуба. Цікавыя планіровачныя рашэнні і дызайн – ад удзельнікаў конкурсаў — студэнтаў універсітэтаў і мясцовых жыхароў.



## 28. Прадметы сілы

Стварэнне аб’ектаў поспеха, дэманстрацыя пераўтварэнняў, магчымасцей і рэальнасці пераменаў адыгрываюць важкую ролю ў фарміраванні пазітыўнага настрою жыхароў у працы дзеля ўстойлівасці. Мы пачыналі з малога. Спачатку гэта была першая альпійская горка на цэнтральнай вуліцы, чысты двор і пад’езд дома, абсталяваная стаянка для ровараў ля гандлёвага цэнтра і станцыі, потым – новыя кантэйнеры для раздзельнага збору смецця, клумбы на вуліцах, камп’ютэр для агульных патрэбаў у выканкаме…



## 29. Устойлівыя закупкі

Наш выканкам і наша школа, мясцовы бізнес і Дом культуры, а таксама іншыя нашы арганізацыі і ўстановы даволі часта нешта купляюць. Трэба абнавіць мэблю, набыць канцэлярскія тавары і паперу, заправіць бензінам аўтамабіль, купіць матэрыялы для рамонту. У гэтых справах мы стараемся прытрымлівацца прынцыпаў устойлівасці. Купляць сертыфікаваную прадукцыю, выробленую без выкарыстання шкодных хімічных рэчываў, пазначаную спецыяльнымі эка-лэйбламі. Мы ў першую чаргу звяртаемся да мясцовых вытворцаў тавараў і паслуг, бо гэта змяншае "экалагічны" адбітак ад іх вытворчасці.



## 30. Старыя сады

Мы не сталі пілаваць стары сад на ўскрайку мястэчка, а расчысцілі яго, абрэзалі дрэвы, навялі парадак. Зараз тут — любімае месца адпачынку жыхароў. А ўвосень сад адорвае смачнымі яблыкамі і ігрушамі старых гатункаў. У дуплах старых яблынь гнездзіцца мноства птушак, у тым ліку рэдкіх, а на зямлі таксама буяе прырода. Мы вывучылі відавы склад дрэў і іншых раслін нашага сада, адзначылі самае старое дрэва. Даведаліся, што за мяжой існуюць нават спецыяльныя турысцкія маршруты "Па старым садам Еўропы" і збіраемся ўсталяваць кантакты з гэтай суполкай. У будучым мы таксама плануем праводзіць "Садовыя фэсты" у гэтым маляўнічым кутку.



# IV. Мясцовыя рэсурсы

## 31. Гісторыя

Мы ўвесь час вывучаем, зберагаем і прапагандуем сваю гісторыю. З гэтай мэтай, напрыклад, можна рэканструяваць ці пабудаваць ізноў гістарычны цэнтр, старажытныя збудаванні, стварыць непаўторнае і незабыўнае аблічча беларускага Мястэчка. Магчыма аднаўленне гарадской ратушы з гадзіннікам, элементаў старажытнай фартэцыі, ланцужка кірмашовых шапікаў…



## 32. Нашы перавагі

Мы шукаем, знаходзім і падкрэсліваем моцныя бакі, перавагі нашага Мястэчка. Такімі перавагамі, сярод іншых, з’яўляюцца: меншы кошт жылля, пешаходная даступнасць працы, аб’екты прыроды, гісторыі і культуры, чыстае паветра і цішыня. Да гэтага можна дадаць натуральную “хатнюю” ежу, чыстую ваду, лес, рыбалку, ягады і грыбы. Не трэба забывацца аб колькасці жыхароў, перажыўшых 100 гадоў і больш, урадлівай глебе, ветлівых людзях, спевах птушак ля вакна ўранку…



## 33. Заметнае месца

Мы ператвараем наша Мястэчка ў месца, дзе ладзяцца фестывалі і канферэнцыі, кірмашы і з’езды, семінары і святы, сімпозіумы і трэнінгі, канцэрты і тэатральныя пастаноўкі… Імя нашага мястэчка ўбачыш у Інтэрнэце (у нас ёсць свой сайт) і на старонках прэсы, мы падрыхтавалі і пры кожнай магчымасці дэманструем відэафільм пра свой край. Каб атрымаць прыгожыя здымкі нашых мясцін, мы падымаліся ў паветра на мотадэльтаплане… Затое нашы маляўнічыя краявіды былі надрукаваны ў многіх выданнях…



## 34. Прапануем будынкі і пляцоўкі

Мы прапануем будынкі, якія не выкарыстоўваюцца летам (школы) для правядзення летнікаў, семінараў, плэнэраў мастакоў і скульптараў, майстроў-рэзьбароў па дрэву… Акрамя таго з дапамогай некалькіх праектаў мы добраўладкавалі пляцоўку для фэстаў, якую зараз маем магчымасць прапанаваць для заезджых фэстаў і спаборніцтваў.



## 35. Мясцовыя разынкі (самае-самае!)

Заўсёды людзей прываблівае нешта ўнікальнае, своеасабовае, так званыя “разынкі”. Гэта вельмі важна і для мясцовага развіцця. Таму мы шукаем такія адметнасці нашых мясцінаў і шырока інфармуем пра нашы “адзіныя ў свеце” гістарычныя помнікі, аб’екты культуры, прыродныя ўнікумы, маляўнічыя пейзажы, магчымасці ўбачыць рэдкіх жывёл ці расліны, пазнаёміцца з цікавымі народнымі звычаямі, паспытаць тыповыя тутэйшыя стравы і напоі, папіць “жыватворнай" вады са святой крыніцы… Калі чуеш пра самы маленькі горад у краіне (Дзісна), пра сельсавет з 16 азёрамі (Пераброддзе), радзіму першага прэзідэнта Ізраіля (Моталь), лепшыя кірмашы ў Еўропе (Зэльва).., то цікаўнасць патрохі пачынае падштурхоўваць цябе ў тым накірунку…



## 36. Крэатыўны падыход

Калі раптам у вас не атрымліваецца знайсці некалькі унікальных “разынак”, “раскрутка” якіх магла б каталізаваць мясцовае развіццё, то можна іх прыдумаць. Можна адчаканіць манету (як мы аднойчы ўбачылі ў некаторых краінах), можна ў “кансервах” гандляваць тыповым мясцовым паветрам (як робяць, напрыклад, у Берліне)… А аднойчы скульптары па каменю заўважылі на нашай тэрыторыі каштоўныя рэсурсы для творчасці — мясцовыя камяні-валуны. Во гэта быў плэнэр! Актыўна ўдзельнічалі і мясцовыя дзеці. У выніку нашу плошчу ўпрыгожваюць арыгінальныя каменныя скульптуры.

А калегі з Польшчы паведалі, як аднойчы звярнулі ўвагу на добры ўраджай цыбулі на прысядзібнай дзялянцы адной мясцовай жыхаркі… А зараз там — нацыянальнага ўзроўню “цыбульныя фэсты” ладзяцца, пайшоў у рост мясцовы бізнес, таксама з акцэнтам на “цыбульную” тэму…



## 37. Патэнцыял сімвалаў

Добра, калі з даўніны дайшлі да нас гербы і сцягі… Гэта вельмі важкі элемент “мясцовага капітала”. Раскрутка сімвалаў горада дае добрыя магчымасці для маркецінга тэрыторыі. Калі пакуль што ў вас такіх гербаў і сцягоў няма — трэба неадкладна аднавіць іх, ці распрацаваць новыя (добра, калі на конкурснай аснове з удзелам грамадскасці). А потым выкарыстоўваць гэтыя выявы як мага шырэй.

Сімвалаў можа быць даволі многа. Аднойчы, вывучаючы матэрыялы рэгіянальнага развіцця ЗША, мы ўбачылі паштовыя карткі, прысвечаныя асобным штатам. На гэтых паштоўках былі адлюстраваныя:

- Гімн штата.
- Птушка штата.
- Дрэва штата.
- Звер штата.
- Рыба штата.
- Кветка штата…

Мы плануем зрабіць нешта накшталт гэтага і ў нашым Мястэчку. А можа яшчэ дададзім: страва мястэчка, напой… пляска… гульня…



## 38. Візуалізацыя

Мы збіраемся вырабіць канверты, паштоўкі і маркі з выявамі нашага мястэчка і дамагчыся, каб менавіта яны заўсёды меліся на мясцовай пошце, і будзем выкарыстоўваць іх для дзелавой карэспандэнцыі выканкома і іншых муніцыпальных установаў.

Сярод нашых іншых планаў — усталяваць на трасах указальнікі напрамкаў да нашага мястэчка прыкладна такога зместу: “Да Мястэчка засталося 100 км”.

Распрацуйце таксама маляўнічую карту вашай мясцовасці (у нас яна вісіць на чыгуначнай станцыі, але можна змясціць яе і ў муніцыпальным холе ці клубе). Адзначце на ёй усе “самыя” (унікальныя, “адзіныя ў свеце”) мясцовыя адметнасці — старажытны мост праз раку, самае старое дрэва, самае глыбокае возера, самы высокі пагорак, самае старажытнае збудаванне…



## 39. Падтрымка бізнесу

Мы праводзім сістэматычную палітыку стварэння, падтрымкі, утрымання і прыцягнення бізнесу. Нашымі дадатковымі рэсурсамі ў гэтай справе становіцца падтрымка, каб прадпрымальнікі хутчэй зарэгістравалі свой бізнес, набылі нерухомасць. Мы рэгулярна ладзім сустрэчы — нарады з прадстаўнікамі мясцовага бізнесу, на якіх абмяркоўваем узаемна цікавыя пытанні, ствараем інфармацыйныя цэнтры для пачынаючых бізнесменаў і нават бізнес-інкубатары.



## 40. Сацыяльны капітал

Мы ўмацоўваем наш мясцовы сацыяльны капітал – патэнцыял мясцовых уладаў, дэпутатаў, супрацоўнікаў мэрыі, актывістаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. Мы заахвочваем іх павышаць кваліфікацыю, вучыцца, удзельнічаць у семінарах і канферэнцыях, выставах і навучальных паездках, іншых мерапрыемствах, дзе можна не толькі набрацца новых ведаў, але і ўсталяваць карысныя кантакты.



## V. Партнёрства

### 41. Грамадская супольнасць

Мы дапамагаем стварэнню і развіццю грамадскіх арганізацый і ініцыятываў, фондаў, асацыяцый, таварыстваў уласнікаў, саветаў і саюзаў прадпрымальнікаў. І гэтыя структуры ператвараюцца ў дадатковыя крыніцы рэсурсаў для ўстойлівага развіцця нашага Мястэчка. Нядаўна наш Савет дэпутатаў перадаў пад патрэбы грамадскіх арганізацій будынак старой (але яшчэ крэпкай!) пачатковай школы. Такім чынам створаны “Інкубатар грамадскіх арганізацый і ініцыятыў”.



## 42. Каардынацыя

Мы ўзмацняем каардынацыю з усімі партнёрамі — структурамі грамадзянскай супольнасці (грамадскімі арганізацыямі і фондамі, прафесійнымі саюзамі і некамерцыйнымі ўстановамі, маладзёжнымі ініцыятывамі і гурткамі пажылых людзей…) і бізнесам, дзяржаўнымі прадпрыемствамі і ўстановамі, экспертамі з універсітэтаў і навуковых арганізацый…



## 43. Пабрацімства

Мы завязваем сяброўскія сувязі з іншымі гарадамі, як у нашай краіне, так і за яе межамі, падпісваем дамовы аб пабрацімстве, памежным супрацоўніцтве і працуем разам на агульную карысць. Асобна некаторыя нашы арганізацыі (школы, музей) таксама развіваюць пабрацімскія сувязі з калегамі з-за мяжы.



## 44. Прызнанне заслуг

Партнёрства патрабуе прызнання заслуг. Таму мы замацавалі і даволі шырока выкарыстоўваем званне “Ганаровы грамадзянін Мястэчка”, а таксама стварылі і святкуем Дзень ганаровых людзей. Мы ўшаноўваем доўгажыхароў (тых, каму споўнілася 100, 90, 80, 75 гадоў), наведваем іх, дарым падарункі, просім журналістаў надрукаваць інтэрв’ю з такімі людзьмі. А нядаўна мы прынялі палажэнне аб ганаровым медалі “За заслугі перад Мястэчкам” і рыхтуемся ўзнагародзіць першых намінантаў.



## 45. Землякі

Мы ўсталёўваем і падтрымліваем сувязі з нашымі землякамі, якія зараз жывуць у іншых мясцінах — гарадах і вёсках нашай краіны і замежжа. Мы прапануем ім магчымасці прыняць удзел у справах па развіццю нашай супольнасці. Так, напрыклад, у Польшчы рэалізавалася праграма "Адраджэнне малой Радзімы". У нас створана "Кніга добрых спраў", дзе фіксуюцца ўкладанні землякоў у развіццё мястэчка.



## 46. Міністэрствы, дэпутаты Парламента

Яны таксама могуць быць (а па сутнасці — з’яўляюцца) партнёрамі ў працы па ўстойлівым развіцці тэрыторый. Мы звяртаемся да іх, запрашаем на нашы мерапрыемствы, інфармуем пра планы, раімся, просім падтрымкі. Такім чынам, як у кожным сапраўдным партнёрстве, выйграюць абодва бакі. Часам мы рыхтуем неабходныя “загатоўкі” патрэбных нам лістоў падтрымкі ад “высокіх” структур і перадаем іх ім, тым самым спрашчаем і паскараем падрыхтоўку такіх лістоў.



## 47. Краіны і іх амбасады

Сівая гісторыя нашых мясцін утрымлівае ў сабе мноства сведкаў кантактаў з рознымі краінамі і народамі. У нашым Мястэчку па праекту архітэктара з Італіі быў пабудаваны палац. Нямецкі славуты батанік некалі стварыў тут знакаміты батанічны сад. Варагі са Скандынавіі праходзілі тут па шляху “з варагаў у грэкі”. Адсюль з’ехаў у Францыю бедны мастак, які стаў потым прадстаўніком славутай “французскай школы”. Нашы землякі на першых ролях удзельнічалі ў стварэнні дзяржавы Ізраіль, змагаліся за незалежнасць ЗША… Ёсць добрыя магчымасці распрацоўкі адмысловых праектаў. За падтрымкай іх можна звяртацца ў амбасады гэтых краін і завязваць з імі сталыя партнёрскія адносіны.



## 48. Магчымасці Інтэрнэта

Мы ўсталёўваем сувязі праз Інтэрнэт з калегамі другіх гарадоў і краін, абменьваемся з імі інфармацыяй, абмяркоўваем праектныя ідэі. Да гэтых абмеркаванняў добра далучыць экспертаў, якія дапамогуць пры вырашэнні праблем і будуць садзейнічаць узмацненню няўстойлівага патэнцыялу. Мы становімся дужэйшымі, аб’ядноўваючы праз Інтэрнэт новых партнёраў. Па сутнасці, складаецца віртуальны “Клуб сяброў нашага Мястэчка”.



## 49. Пляцоўкі для зносін

Стварайце месцы для зносін паміж жыхарамі, магчымасці для сустрэч і абмену думкамі. Лепш, калі гэта не заўсёды будзе кабінет у выканаўчым камітэце, а напрыклад, гарадская плошча, парк, пешаходная зона, набярэжная. З набыткаў нашых замежных партнёраў мы ведаем пра рэгулярныя “пасядзелкі з мэрам” на лаўцы ў парку, удзел мясцовых паліцыянтаў (не ў форме!) у маладзёжным пікніку… Усё гэта спрыяе аб’яднанню вашай абшчыны, будуе добрыя нефармальныя кантакты і давер.



## 50. Лідэрства

Забеспячэнне лідэрства — важная падстава для партнёрскіх зносін. Адказнасць за справу, якая выконваецца ў партёрстве з іншымі ўдзельнікамі праекта, патрабуе лідэрскіх намаганняў. Тут патрэбны і прафесійны падыход, і арганізатарскія здольнасці, і настойлівасць, і аптымізм, і пачуццё гумару... Праектнае лідэрства адрозніваецца ад лідэрства "па пасадзе". Часта кіраўнік праекта — гэта нефармальны лідэр (ці — лідэры), але на якога "працуюць" і фармальныя начальнікі... Ролі ў камандзе могуць мяняцца ў сувязі са зменамі абставін.



# VI. Разнастайнасць

## 51. Дыверсіфікацыя эканомікі

Мы стараемся супрацьстаяць монаарыентацыі эканомікі, паступова развіваючы розныя віды вытворчасці і сферу паслуг. Пад новыя бізнес-інвестыцыі мы выставілі на аўкцыённыя таргі дзялянкі зямлі з праведзенай інфраструктурай. Перавагу збіраемся аддаваць “зялёнай” эканоміцы, інавацыйным праектам, IT і лічбавым тэхналогіям, а таксама вытворчасці з выкарыстаннем мясцовых рэсурсаў.



## 52. Традыцыі

Традыцыі і веды мясцовага люду — частка культурнай разнастайнасці нашага краю. Мы заўсёды думаем пра захаванне, адраджэнне і развіццё традыцый (у святах і абрадах, спевах і плясках, мастацтве і выхаванні, аздабленні нашых сядзіб і адзенні, мясцовых прыказках, прымаўках, легендах і забабонах, у народнай гаворцы і кухні, эканоміцы…). Жывуць, напрыклад, сярод нас (можа, як ні ў якой іншай еўрапейскай краіне!) традыцыі, звязаныя з пошукам Купальскай кветкі, абедамі на могілках на Радуніцу, шанаваннем старых дрэваў і печы ў хаце, верай у розных нячысцікаў і злыдняў недзе на гарышчы… Усё гэта – наш агульны капітал, які цяжка палічыць у грошах, але які значна падмацоўвае наша развіццё.



## 53. Рамёствы

Падтрымлівайце развіццё традыцыйных мясцовых рамёстваў, адраджайце зніклыя і садзейнічайце ўзнікненню новых. Ткацтва, вышыванкі, ганчарства, пляценне з лазы і саломы, выраб сыроў, выцінанкі, шапавальства, дрэваапрацоўка, выраб цацак, посуду з дрэва (бандарства)… дапамогуць стварыць прывабны імідж вашага Мястэчка, будуць працаваць на падтрымку і распаўсюджанне культурна-гістарычных каштоўнасцяў, могуць даць дадатковы заробак многім мясцовым жыхарам, створаць “масток” паміж былымі і будучымі пакаленнямі. Дапамажыце мясцовым майстрам прадставіць іх вырабы на выставах, фэстах і кірмашах, там яны будуць рэкламаваць ваша мястэчка на ўсю краіну.



## 54. Розныя людзі

Розныя людзі — жанчыны і мужчыны, малыя і старыя — дадатковыя магчымасці для развіцця. Мы падтрымліваем нашых аднадумцаў і адзначаем іх поспехі. Дзеля гэтага, напрыклад, мы арганізавалі галерэю партрэтаў “Імі наша Мястэчка ганарыцца” з карцінамі і фотаздымкамі значных постацяў у нашай гісторыі.

Мы далучаем да культурнага жыцця нашага Мястэчка прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія жывуць у нашым мястэчку, разам арганізоўваем нацыянальныя фэсты і святы, ці хоць бы невялічкія нацыянальныя “падворкі” на нашых традыцыйных фэстах. Праз прадстаўнікоў іншых краін і народаў мы усталёўваем сувязі з гарадамі і вёскамі, адкуль яны паходзяць.

Мы ладзім у нашым мястэчку Літаратурны форум у гонар знакамітага нашага земляка-пісьменніка, у якім удзельнічаюць вядомыя пісьменнікі і паэты.



## 55. На вялікую сцэну

Мы выкарыстоўваем розныя віды дзейнасці для папулярызацыі нашага Мястэчка, ствараем і падтрымліваем спартыўныя каманды, музычныя калектывы, прафесійныя аб’яднанні, гурткі па інтарэсам… і садзейнічаем ім выйсці на “вялікую сцэну”.



## 56. Рэклама

Гэта рухавік не толькі гандлю, але і мясцовага развіцця. Таму мы распрацавалі разнастайныя рэкламныя матэрыялы (сцяжкі, значкі, сувеніры, майкі, шапкі, хусткі, календары, кубкі, талеркі, расцяжкі…) з выявамі нашага герба і лагаціпа і шырока распаўсюджваем іх. У тым ліку падтрымалі стварэнне мясцовага прадпрыемства па іх вытворчасці.

Мы ўсталявалі на цэнтральнай плошчы вялікі слуп, на які прымацавалі дошчачкі-стрэлачкі, якія паказваюць, дзе і як далёка знаходзяцца цікавыя аб’екты нашага Мястэчка.



## 57. Брэндзінг

Разам з мясцовым бізнесам распрацуйце і падтрымайце (можна праз сумесны праект выканкома і грамадскай арганізацыі) мясцовыя таварныя знакі (для сферы вытворчасці і паслуг), брэнды. Яны будуць працаваць адначасова на маркецінг гэтых вырабаў і паслуг і на вядомасць вашага Мястэчка. Добра, калі ў брэндавых назвах будуць скарыстаны назва мястэчка ці каларытныя мясцовыя словы. Калісь гучала па ўсёй Еўропе “Дзісненскае масла”, зараз – “Мотальскія прысмакі”. Адраджаецца “Ганненскі кірмаш у Зэльве”, раскручваецца “Жалудоцкі фэст кветак” і “Журавы і Журавіны” на Міёршчыне…



## 58. Музей-клуб з унікальнымі экспанатамі

Мясцовыя краязнаўчыя музеі часта бываюць вельмі падобныя адзін на аднаго і не вельмі прываблiваюць наведвальнікаў. Але пры творчым падыходзе яны могуць стаць элементамі мясцовай культурнай разнастайнасці і стала працаваць на мэты ўстойлівага развіцця. У межах аднаго з праектаў мы вырашылі стварыць арыгінальны “Музей-клуб нашага Мястэчка”. Якраз ад былых гаспадароў вызваліўся будынак старой бібліятэкі, якая перабралася ў іншы навейшы будынак. І мы пачалі працу, каб удыхнуць новае жыццё ў старую хату. Экспанаты прынеслі мясцовыя жыхары, мы запрасілі экспертаў-навукоўцаў з абласнога ўніверсітэта. Вырашылі стварыць не проста “нежывы” музей, а музей-клуб, дзе будуць збірацца жыхары, праводзіцца семінары, майстар-класы па рамёствам. Экспазіцыя будзе разгорнута вакол аднаго ўнікальнага здабытка, і атрымаецца своеасаблівы “Музей аднаго экспаната”: падобны мы бачылі ў Англіі…



## 59. Погляд звонку

Бывае, што мясцовыя жыхары, прывыкшыя да свайго асяроддзя, могуць не заўважаць разнастайнасці прыроды і культуры, якія даўно існуюць побач. Тут нам дапамагаюць эксперты. Мы запрашаем іх праводзіць у нас экспедыцыі, вывучаць нашы мясціны. Гэта дазволіла выдаць кніжку пра нашу (унікальную!) кулінарную спадчыну, апісаць віды жывёлаў і раслін, сабраць прыказкі і прымаўкі, сфатаграфаваць традыцыйныя строі з куфэркаў, выдаць кнігу ўспамінаў, запісаць песні… У кожнага з наведвальнікаў нашых мясцін на развітанне мы пытаемся: “Што вам у нас спадабалася? Што здзівіла? Чаму вам бы хацелася ізноў наведаць наша мястэчка?”. Адказы на гэтыя пытанні — каштоўная крыніца ідэй для развіцця нашага краю.



## 60. Выкарыстанне SWOT-аналізу

Вельмі добрым інструментам для выяўлення разнастайнасці нашага краю з’яўляецца SWOT-аналіз. Гэты метад не патрабуе многа часу для працы з насельніцтвам, ён зразумелы ўдзельнікам сходаў, просты і недарагі. Ён таксама добра злучаецца з іншымі метадамі збора дадзеных, экспертнымі распрацоўкамі. SWOT-аналіз можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах працы па ўстойлівым развіцці. Важна пачаць з пазітыва (моцныя бакі), пастарацца, каб абмеркаванне стала сапраўдным калектыўным “мазгавым штурмам”, які нараджае мноства яскравых ідэй.



## VII. Інавацыі

### 61. “Разумнае мястэчка”

Наш арыенцір — канцэпцыя “smart town”. Мы укараняем IT і лічбавыя тэхналогіі ў кіраванне жыллёвай гаспадаркай, для ўліковых функцый, выдачы даведак, ствараем гарадскую камп’ютэрную сетку. Гэта будзе спрыяць стварэнню атмасферы камфортнага і добра арганізаванага горада. У перспектыве мы плануем аб’яднаць нашы інфармацыйныя сеткі ў адну сістэму, якая павысіць узровень і эфектыўнасць кіравання.



## 62. Вучымся – даследуем – укараняем

Мы арыентуемся на інавацыі, арганізуем паездкі прадстаўнікоў мястэчка (і ў першую чаргу – моладзі) на навукова-тэхнічныя выставы, выкарыстоўваем магчымасці найноўшых тэхналогій пры будаўніцтве і рэканструкцыі будынкаў. У нашых планах – падтрымка стварэння пры мясцовых прадпрыемствах канструктарскіх і даследчых аддзелаў.



## 63. Сябруем з экспертамі

Сяброўства з экспертамі павышае наш інавацыйны патэнцыял. Мы запрашаем кансультантаў, спецыялістаў у розных галінах да супрацоўніцтва, прапануем ім далучыцца да вырашэння канкрэтных праблем нашага мястэчка. Мы зацікаўліваем іх магчымасцямі рэалізацыі на нашай тэрыторыі іх ідэй і распрацовак, правядзення эксперыментальных работ, экспедыцый, навукова-даследчых прац. Мы выкарыстоўваем магчымасці правядзення конкурсаў, навуковых семінараў і канферэнцый. Дзеля гэтага мы звяртаемся ў навукова-даследчыя інстытуты Акадэміі навук, іншыя навуковыя ўстановы, праектныя арганізацыі, універсітэты. Мы ладзім сталыя кантакты з вядомымі вучонымі і спецыялістамі. Магчыма, што яны таксама даўно шукаюць і вас у якасці партнёраў для рэалізацыі іх праектаў.



## 64. Конкурсы і спаборніцтвы

Хутчэйшаму ўкараненню інавацый дапамагаюць конкурсы і спаборніцтвы. Мы ладзім штогадовыя конкурсы на ўзорную сядзібу, самы квітнеючы падворак, самы прыгожы сад. Паступова мы хочам дадаць да гэтых намінацый такія, як “самы экалагічны” і “самы ўстойлівы” (з улікам прынцыпаў устойлівага развіцця). Таксама важна не забывацца пра конкурсы для працаўнікоў (напрыклад, “Лепшы па прафесіі” і “Лепшы прадпрымальнік”).



## 65. Аграэкатурызм

Для мноства краін і нашых мясцін вясковы і экалагічны турызм — ужо даўно не інавацыя. А вось для яшчэ вялікай колькасці нашых мястэчкаў і вёсак — гэта пакуль што новая справа, якая патрабуе падтрымкі. Таму мы зацікаўліваем мясцовых жыхароў у кроках у гэтым накірунку. Каб яны пачыналі прымаць турыстаў, распаўсюджваем маючы вопыт, самі паказваем прыклад. А яшчэ рэкламуем нашы мясціны і выстаўляем на аукцыёны пустуючыя будынкі для гатэлевага бізнесу, каб яны інвеставалі яго развіццё на нашай тэрыторыі. Наша стратэгічная мэта — каб кожны турыст, які прыязджае ў Беларусь, ведаў пра наша Мястэчка і стараўся абавязкова завітаць да нас.



## 66. Прыцягнуць адукацыю і навуку

У барацьбе за канкурэнтаздольнасць гарады і раёны стараюцца скарыстаць новыя магчымасці. Адным з такіх эфектыўных інструментаў развіцця тэрыторый з’яўляецца прыцягненне ў свае гарады адукацыйных і навуковых установаў — вучылішчаў, каледжаў, філіялаў тэхнікумаў і ўніверсітэтаў, навукова-даследчых інстытутаў, канструктарскіх бюро і лабараторый. Часта пачынаюць з маленькага — дапамагаюць (напрыклад, праз выдзяленне будынкаў) стварэнню летніх студэнцкіх лагераў і станцый, пункта паназіранню за птушкамі… Новыя працоўныя месцы ў навуковых і адукацыйных установах маюць вялікі пазітыўны ўплыў на іншыя бакі развіцця гарадоў і мястэчак.



## 67. Лепш пабачыць

Мы заўсёды шукаем людзей і арганізацыі, якія ўжо маюць пэўны вопыт у працы па ўстойлівым развіцці, у вырашэнні праблем іх тэрыторый, у ўкараненні інавацый. Мы вучымся на іх дасягненнях і памылках, пераймаем вопыт, раімся. Дзеля гэтага мы практыкуем паездкі да нашых калегаў у іншыя рэгіёны краіны, ладзім сумесныя круглыя сталы і нарады, ездзім у госці на мясцовыя кірмашы і фэсты. Як кажуць: лепш адзін раз пабачыць…



## 68. Забытае старое

Часам кажуць, што новае — гэта добра забытае старое. Так, раней, калі з транспартам “было туга”, большасць мясцовага гандлю адбывалася мясцовымі ж вырабамі і прадуктамі. Потым прыйшла глабалізацыя, і часам у нейкім невялікім гарадку з цяжкасцю знойдзеш на паліцы ў краме нешта мясцовае… А тут прыйшоў час, калі людзі пачалі з недаверам адносіцца да прывазнога тавару: “З чаго зроблены гэтыя заморскія прысмакі?”, “Што там у той кілбасе?”, “А садавіна і гародніна, здаецца, добра апрацавана хіміяй!”. Попыт на натуральныя, прыродныя, экалагічна чыстыя прадукты нарадзіў новыя прапановы. У Англіі мы ўбачылі “Farm shop” (Вясковую краму), дзе гандлявалі прадуктамі, вырабленымі толькі ў 30-мільным радыусе. І асартымент быў неблагі, а за якасць адказваў канкрэтны вытворца, з якім можна было абмеркаваць, замовіць нешта на Каляды… У нашых планах — стварыць такую краму і ў нашым мястэчку. А пакуль мы інвеставалі ў наш кірмаш: абнавілі гандлёвыя рады, папралі стрэхі над прылаўкамі, правялі свет і ваду, абсталявалі ўборную. Пайшоў гандаль!



## 69. Мястэчказнаўства

Гэта — адукацыйная інавацыя настаўнікаў нашай школы. Яны распрацавалі, а мы ўсе разам праз “краудфандынг” сабралі грошы і надрукавалі падручнік “Мястэчказнаўства”. У ім сабраны матэрыял пра наша Мястэчка, яго гісторыю і культуру, эканоміку і прыродны патэнцыял. Зараз маленькія жыхары нашага мястэчка знаёмяцца з месцам, дзе жывуць, і на школьных уроках. Асобныя часткі падручніка — перспектывы развіцця нашага мястэчка, папулярнае тлумачэнне прынцыпаў устойлівага развіцця.



## 70. Глядзім наперад

Каб не застацца збоку ад міравых працэсаў і быць, як кажуць, “у трэндзе”, мы ўважліва сочым за інавацыямі, спрабуем хуценька іх прымяніць. Зараз, напрыклад, мы вывучаем магчымаць развіцця ў нашым Мястэчку эканомікі сумеснага спажывання (sharing economy). І мы будзем вам удзячныя, калі вы прыміце ўдзел ва ўкараненні гэтай інавацыі ў нашым мястэчку. Далучайцеся, давайце свае прапановы на наш рэгулярны конкурс стартапаў!

Мы таксама пачалі вывучаць магчымасць выкарыстання ў нашым мястэчку праектнага механізма выдаткавання сродкаў з мясцовага бюджэту. Спачатку частку нашых рэсурсаў мы выставім на конкурс: няхай лепшая інавацыйная прапанова атрымае падтрымку. Потым думаем пашыраць гэты падыход, далучаць магчымасць дадатковага фінансавання (напрыклад, праз “краудфандынг” ці ўдзел у міжнародных праектах).



## VIII. Эфектыўнасць

### 71. Прыярытэты

Выбар невялікай колькасці найважнейшых напрамкаў працы дазваляе нам сканцэнтраваць рэсурсы і выкарыстаць іх больш эфектыўна. У нашай стратэгіі ўстойлівага развіцця Мястэчка мы зацвердзілі (на падставе абмеркаванняў з жыхарамі і экспертамі) тры такіх прыярытэты:

1. Развіццё малога бізнесу.
2. Азеляненне мястэчка.
3. Вырашэнне праблемы смецця.

Некаторыя нашы калегі з другіх мястэчкаў і гарадоў аддалі перавагу стварэнню ўмоў для самарэалізацыі моладзі, добраўпарадкавання вуліц і сквераў, адукацыі і выхавання для ўстойлівага развіцця, агратурызма, энергазберажэння… Фіксаванне прыярытэтаў дапамагае нам крок за крокам вырашаць найбольш злабадзённыя пытанні і мэтанакіравана рухацца да жадаемай будучыні.



## 72. Замкнутыя цыклы

У стратэгіі, кароткатэрміновых планах і праектах у сферах вытворчасці і паслуг мы арыентуемся на стварэнне замкнутых ланцужкоў “вытворчасць — спажыванне” (калі, напрыклад, мясцовая пякарня забяспечвае хлебабулачнымі вырабамі мясцовых жыхароў, школу, кафейню.., далей адходы перадаюцца фермерам ці ў асабістыя падсобныя гаспадаркі, адкуль новая прадукцыя (яйкі, мяса) зноў ідзе ў спажыванне праз мясцовы кірмаш…

Такія невялікія элементы “цыркулярнай эканомікі” можна арганізаваць у сферы турызма, будаўніцтва і іншых галінах гаспадаркі.



## 73. Інвентарызацыя і рэалізацыя нерухомасці

Погляд праз прызму эфектыўнасці патрабуе правесці, як адно з першых, інвентарызацыю закінутых, недабудаваных аб’ектаў нерухомасці (былых крамаў і сталовых, складаў і доўгабудаў), якія разбураюцца і не выкарыстоўваюцца. Дамажыцеся іх прыватызацыі ці продажу, альбо перадайце новаму эфектыўнаму ўласніку. Актыўна працуйце па гэтым пытанням з дзяржаўнымі структурамі. Смела пішыце лісты ў міністэрствы і Дэпартамент дзяржаўнай уласнасці. Зрабіце фотаздымкі гэтых аб’ектаў і размясціце іх на сайце, у сацыяльнай сетцы, ці ў прэсе. Часам гэта добра можа падштурхнуць нядбайных кіраўнікоў дзяржаўнай уласнасці. Добра, калі аукцыёны па продажы нерухомасці і правоў арэнды праводзяцца рэгулярна. Гэта прыцягвае інвестараў.



## 74. Конкурсы і тэндэры

Добры эфект дае правядзенне адкрытых конкурсаў, тэндэраў (друкуйце аб’явы ў прэсе і Інтэрнэце) на выкананне муніцыпальных (сацыяльных) заказаў. Гэта можа прыцягнуць увагу новага бізнесу ў ваша мястэчка. Але, з іншага боку, памятайце пра задачу супрацьстаяць таму, каб рэсурсы “выцякалі” з вашага раёна. Таму не забывайцеся пра мясцовы бізнес; пры аднолькавых умовах ёсць сэнс аддаць перавагу яму. У такім разе вашы фірмы і жыхары атрымаюць заробкі і заплацяць падаткі ў мясцовы бюджэт.



## 75. Стымулы

Мы стварылі і заўсёды развіваем сістэму стымулаў дзеля эфектыўнай працы на карысць нашага мястэчка. У нас у пашане настаўнікі, якія дапамагаюць дзецям развіваць прадпрымальніцкія здольнасці. Самаадукацыя таксама ў пашане: на Свяце Мястэчка мы ўзнагароджваем тых, хто больш за іншых пабываў за год на розных выставах, тэатральных пастаноўках, у музеях. Ганаровым з’яўляецца перамога ў мясцовым міні-грантавым конкурсе. Спецыяльны прыз мы ўручаем таму, хто спрабаваў зрабіць нейкі складаны праект, але ў яго не атрымалася. Гэта стымулюе актыўнасць і рызыку.



## 76. Індыкатары

Каб дзейнічаць эфектыўна, трэба фіксаваць канкрэтныя вымяральныя мэты і задачы. Ужо на этапе распрацоўкі візіі жадаемай будучыні перад кожнай мясцовай супольнасцю паўстаюць пытанні: “Як мы зможам ацаніць вынікі нашай працы? Якія паказчыкі мы будзем выкарыстоўваць? На падставе якіх дадзеных разлічваць? Наколькі гэтыя паказчыкі будуць дакладнымі?”.

І тут пачынае праяўляцца адзін з эфектаў выкарыстання індыкатараў: неканкрэтныя мэты і туманныя задачы “адфільтроўваюцца”, а замест іх прапануюцца больш зразумелыя, якія проста тлумачыць і вымяраць. Мы заўсёды надаем многа ўвагі індыкатарам. Вучыцеся і вы працаваць з імі.



## 77. Аналіз і пратакол

Мы ўзялі сабе за правіла рэгулярна аналізаваць эфектыўнасць і мэтанакіраванасць усіх нашых планаў, дзеяў, мерапрыемстваў… Мы абмяркоўваем гэтыя пытанні (і поспехі, і няўдачы) на пасяджэннях Грамадскага савета, робім вывады і карэктуем свае паводзіны. Абавязкова пасля такіх нарад (як і большасці іншых рабочых сустрэч нашай каманды) мы фіксуем вынікі ў выглядзе пратакола пасяджэння і адзначаем у ім тэрміны, рэсурсы і адказных. Гэта вельмі карысна для наступнага кантролю і маніторынга.



## 78. Кааперацыя і кластэры

Аб’яднанне з мэтай больш эфектыўнага рашэння задач кожнага з удзельнікаў заўсёды было правераным метадам павелічэння магчымасцей. Так, напрыклад, балгарскія абшчыны ў горных раёнах недалёка ад мяжы з Грэцыяй аб’ядналі свой патэнцыял для распрацоўкі больш прывабнага турыстычнага прадукта. Адны прапанавалі паназіраць за рэдкімі птушкамі, другія — прайсці па старажытным гістарычным шляхам, трэція — пераначаваць у хаце з нацыянальным каларытам, чацвёртыя — пакаштаваць мясцовыя прысмакі і віно… Так ствараюцца кластэры – аб’яднанні прадпрыемстваў, арганізацый і індывідуалаў. Яны павышаюць эфектыўнасць.

У нашым мястэчку мы падтрымліваем працэсы кааперацыі (напрыклад, арганізацыю спажывецкіх кааператываў) праз распаўсюджванне інфармацыі і перадавога вопыту.



## 79. Малыя справы

Малыя справы і простыя тэхналогіі часта бываюць самымі эфектыўнымі. Таму мы не забываем пра арыентацыю на нескладаныя шляхі для дасягнення задач, а не на дасканаласць, якая часам патрабуе занадта многа напружання і рэсурсаў. Нездарма кажуць: “Лепшае – вораг добрага”.

На адной з канферэнцый па ўстойлівым развіцці тэрыторый было прапанавана выкарыстоўваць тэрмін валарызацыя (valorization), каб пазначыць дзеянні, якія (пры невялікіх выдатках) “дадаюць вартасць”, раскрываюць патэнцыял значна большых каштоўнасцяў. Як прыклад: дастаткова было засыпаць некалькі брудных лужын уздоўж берага ракі — і наша набярэжная ператварылася ў папулярнае месца местачковых шпацыраў у выхадныя дні. А такія сустрэчы, прывітанні і гаворкі ўмацоўваюць мясцовую супольнасць.



## 80. Поспех

Важна, каб поспехі сталі вядомымі. У немцаў ёсць такая прымаўка:”Рабі добрыя справы і кажы пра гэта”. Такая пазітыўная інфармацыя стварае атмасферу актыўнасці і эфектыўнасці. Адны бяруць прыклад з іншых. Гэта дадае смеласці, імпэту.

Распрацуйце прэс-рэліз па выніках паспяховага мерапрыемства і дашліце яго ў сродкі масавай нфармацыі, сацыяльныя сеткі.

Адсвяткуйце разам ваш поспех!



## IX. Інстытуцыйны падмурак

### 81. Стратэгічны падыход

Мы распрацавалі, зацвердзілі і актыўна рэалізуем "Стратэгію ўстойлівага развіцця нашага Мястэчка". Часам такі дакумент называюць Мясцовай павесткай-21 (гэта значыць доўгатэрміновы план дзеянняў на XXI век на прынцыпах устойлівага развіцця). Паслядоўнасць і метады працы па Мясцовай павестцы-21 апісана намі ў іншых выданнях (глядзіце спіс літаратуры ў канцы нататніка).



## 82. Статут Мястэчка

Мы распрацоўваем і збіраемся зацвердзіць “Статут нашага Мястэчка”, урачыста адзначыць гэтую падзею і выкарыстоўваць Статут пры інаўгурацыі мэра. Некаторыя з палажэнняў нашага Статута мы возьмем з гэтага нататніка. Мы мяркуем адлюстраваць у гэтым Статуце таксама і традыцыі, і звычаі тутэйшага люду. Напрыклад, звязаныя са зберажэннем прыроды: не рваць дарма кветак, не лавіць рэдкую для нашых мясцінаў рыбу, абавязкова рабіць кампост з арганічных выкідаў… Са зместам Статута мы будзем знаёміць нашах дзяцей з самага маленства, а таксама гасцей нашага мястэчка.



### 83. Нарматыўная база

Парадак у гэтай справе можа стаць тым ахоўным шчытом, што абароніць справу ўстойлівага развіцця ад аўтарытарызму вышэйшай улады, ці ад абвінавачванняў з боку несвядомых грамадзян і дэструктыўных элементаў. Мы стараемся зацвердзіць Саветам дэпутатаў, ці ўзгадніць (пісьмова) палажэнні, рэгламенты, рашэнні на пасяджэннях выканкома. Дапамогу ў нарматыўна-прававой сферы могуць аказаць грамадскія арганізацыі прававога накірунку дзейнасці.



## 84. Суседнія супольнасці

Мы стараемся каардынаваць нашы планы развіцця з прылеглымі тэрыторыямі, нашымі суседзямі. Часта іх прывабныя бакі дапамагаюць прыцягнуць увагу і да нашага Мястэчка. Адначасова выкананне сумесных праектаў можа даць значную эканомію сродкаў ці адчыніць дзверы да больш маштабных праектаў. Патэлефануйце сёння камусьці з калег з суседняга мястэчка, абмяркуйце сумесны праект.



## 85. Дзень Мястэчка

Усталюйце рэгламент і пастаянную дату (зацвердзіце на Абшчынным Сходзе) Дня Мястэчка і святкуйце яе як яшчэ адзін мясцовы фэст. Няхай гэты Дзень Мястэчка стане днём сустрэчы землякоў і сяброў вашай зямлі. Можна прыўрочыць яго да нейкага традыцыйнага (але пажадана — неафіцыйнага) свята. Некаторыя гарады ладзяць Дзень нараджэння горада — так яны робяць гэтае свята больш вясёлым: гатуецца вялікі торт з мноствам свечак, якія задуваюць малыя дзеці…



## 86. Валанцёры

Мы ствараем і падтрымліваем арганізацыі і нефармальныя ініцыятывы валанцёраў (клубы, ініцыятыўныя групы, прыродаахоўныя патрулі), прадастаўляем ім месца для сустрэч (напрыклад, у бібліятэках). Развіццё валанцёрскага руху прыцягвае к нам валанцёраў з іншых мясцінаў і з-за мяжы. Мы працуем над стварэннем спецыяльнага Дома валанцёрскай працы (ці памяшкання ў агульным Грамадскім цэнтры) з месцамі для адпачынку і вучобы, а таксама з наборам патрэбных інструментаў.



## 87. Грамадскі савет па ўстойлівым развіцці

Напачатку нашай працы па ўстойлівым развіцці мы стварылі Грамадскі савет па ўстойлівым развіцці нашага Мястэчка (ў некаторых мясцінах такія грамадскія структуры маюць назву Груп мясцовых дзеяў). Гэта дазволіла нам аб'яднаць патэнцыял людзей, палепшыць арганізацыю працы, скаардынаваць розныя напрамкі дзеянняў. У склад Грамадскага савета ўвайшлі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, мясцовай улады, бізнесу. На пасяджэнне Грамадскага савета за круглы стол збіраецца моладзь і ветэраны, жанчыны і мужчыны, кіраўнікі мясцовых прадпрыемстваў і рэлігійных арганізацый. Грамадскі савет ператварыўся ўжо ў мазгавы цэнтр нашай мясцовай супольнасці. Мы плануем дзейнасць савета, фіксуем рашэнні ў пратаколах і кантралюем іх выкананне.



## 88. Тэматычныя рабочыя групы

Для больш эфектыўнага вырашэння праблемных пытанняў і стратэгічных планаў мы стварылі пры Грамадскім савеце па ўстойлівым развіцці спецыялізаваныя (тэматычныя) рабочыя групы. Іх колькасць, як правіла, 5 – 7 (а ў некаторых замежных гарадах іх налічваецца некалькі дзесяткаў!). І гэта лічба мяняецца: група расфарміроўваецца, калі задача выканана, і можа ствараецца новая для новых мэтаў. Добра, калі ў складзе тэматычнай рабочай групы ёсць прадстаўнікі мясцовай ўлады, грамадскай супольнасці і бізнесу.



## 89. Новыя завядзёнкі

Мы замацавалі ў "Палажэнні аб Грамадскім савеце па ўстойлівым развіцці" некалькі пунктаў, якія дапамагаюць нам вытрымліваць стратэгічныя накірункі:

- У канцы кожнага пасяджэння мы задаём пытанне: "Ці ўлічылі мы сёння ўсе аспекты ўстойлівага развіцця? Ахову прыроды? Сацыяльныя патрабаванні? Эканамічныя патрэбы? Магчымасці партнёрства? Падтрымку разнастайнасці? Прынцып субсідыярнасці?"
- Ці "працуе" хоць адно з ухваленых сёння дзей (мерапрыемстваў) на прыярытэтныя накірункі нашай стратэгіі ўстойлівага развіцця?
- Ці зафіксавалі мы канкрэтныя індыкатары (пажадана — лічбавыя паказчыкі), каб адсочваць прагрэс у планах?



## 90. Летапіс Мястэчка

Мы завялі “Летапіс Мястэчка”, у якім фіксуем важныя падзеі, якія ў нас адбыліся. Падзеі гэтыя розныя: і адкрыццё новай крамы, і пачатак міжнароднага праекта, і публікацыя справаздачы аб рэалізацыі стратэгіі ўстойлівага развіцця, і юбілей нашых паважаных землякоў. Знойдзецца месца ў Летапісу і справам моладзі. Прадстаўнікі арніталагічнага кружка адзначылі ў ім тое, што яны заўважылі ў мястэчку новы від птушак. Будзе адзначана і рэгістрацыя спажывецкага кааператыву, і юбілейная сустрэча выпускнікоў мясцовай школы. Гэта дапамагае нам помніць пра былое і планаваць будучае.



## X. Мы самі! (Субсідыярнасць)

Згодна прынцыпу субсідыярнасці ва ўстойлівым развіцці, справу можна ажыццявіць, а праблему вырашыць на самым ніжэйшым узроўні, на ўзроўні аднаго чалавека (сям'і, вёскі, нашага мястэчка). Так яно і павінна адбывацца. А "наверх" трэба аддаваць толькі тое, з чым нам самім справіцца на нашым ўзроўні не атрымліваецца.

### 91. Пачынаем з сябе

Каб змены адбыліся ў грамадстве, нават у такой невялікай супольнасці, як наша мястэчка, трэба, каб людзі пачалі з сябе. Каб захацелі нешта зрабіць навакол і каб зрабілі гэта. Ксёнз Булька з Мосара неяк распавёў нам, што адно з першых, што ён зрабіў, калі прыехаў у новы прыход, — гэта прадаў свой магнітафон і купіў самасвал шчэбня, якім засыпаў лужыну перад уваходам у храм. Зараз там, у Мосары, – шырока вядомы парк — батанічны сад, туды прыязджаюць не толькі вернікі, каб паглядзець на прыгажосць, якая пачалася з невялікага крока.

У нашым мястэчку многа прыкладаў такіх пачынанняў. Адзін пасадзіў дрэўцы на сваёй вуліцы, другі зрабіў добрую лаву для агульнага карыстання… Большасць нашых жыхароў маюць на сваіх падворках кампостныя прыстасаванні (скрыні ці проста кучы), куды скідваюцца выкіды з кухні, гарода, біятуалета, абрэзаныя галінкі дрэваў і кустоў. Такім чынам значна зменшылася патрэба ў вывазе смецця… А тое, што не ідзе ў кампост, раздзяляецца, збіраецца асобна і здаецца.



## 92. Мы — піянеры!

Мы стараемся стварыць умовы, каб кожны прадстаўнік нашай мясцовай супольнасці стаў першапраходцам у нейкім з напрамкаў устойлівага развіцця. Рэалізаваць наватарскую ідэю, паспрабаваць зрабіць нешта па-іншаму, зірнуць на знаёмыя справы з іншага пункту гледжання… Так наша абшчына ператвараецца ў жывую лабараторыю, і мы шукаем магчымасці, каб, назапашыўшы вопыту, стаць цэнтрам нацыянальных і міжнародных сустрэч, семінараў і канферэнцый па тэматыцы мясцовай крэатыўнасці… Перавага першых — у тым, што той, хто гаціць шлях у новым напрамку, пажынае лепшы ўраджай. Таму мы смела ўкараняем навацыі, рэалізуем нестандартныя падыходы. Часам мы спачатку робім іспыты новых падыходаў у невялікіх масштабах.



## 93. “Вы самі можаце гэта зрабіць!”

Так мы часта адказваем на крытыку і скаргі. Зрабіць з таго, хто скардзіцца і ўказвае на праблемы, паплечніка і савыканаўцу адмысловага праекта — гэта лепшае выйсце з пункту гледжання будучых вынікаў. Канешне, гэта няпростая справа. Тут трэба быць і дыпламатам і кансультантам для навічкоў. Але справа таго вартая.



## 94. Газета — сімвал самастойнасці

Аднойчы мая калега з Аўстраліі пачала прысылаць мне электронныя варыянты бюлетэня адной з мясцовых супольнасцяў, дзе яна (прафесар універсітэта) і сама жыла. Наколькі ж я здзівіўся, калі даведаўся, што колькасць жыхароў у іх вёсцы — 70! (плюс жыхары навакольных хутароў — каля 150). Так, нават маленькая супольнасць можа дзейнічаць самастойна, выдаючы, напрыклад, газету ці бюлетэнь. Там можна пісаць пра мясцовыя навіны: выпускны школьны баль, перамогу мясцовай каманды ў раённым спаборніцтве, абмяркоўваць планы будоўлі басейна ў мястэчку, віншаваць з днём нараджэння і вяселлем. Так газета можа стаць аб'яднаючым звяном для мясцовай супольнасці.



## 95. Пачынаем з простага

“Лепш сініца ў руцэ, чым журавель у небе” — так гучыць народная прымаўка. “Вялікі шлях пачынаецца з першага кроку”, — казаў мудрэц. Так і ў працы па развіццю вашай тэрыторыі не спяшайцеся брацца за грандыёзныя праекты. Мы ведаем, як сустрэча сяброў з сабакамі на палянцы на ўскрайку гарадка можа перарасці ў рэгіянальны фэст. А добраўпарадкаванне парка пачыналася з невялікай валанцёрскай акцыі. Свята вуліцы можа падштурхнуць да вырашэння “застарэлых” пытанняў добраўпарадкавання. Такія невялікія мерапрыемствы дапамагаюць звярнуць увагу на праблему ці інавацыйную ідэю, пашырыць кола яе прыхільнікаў.



## 96. Нашы магчымасці — галоўны рэсурс развіцця

Гэтая акалічнасць часам хаваецца “за заслонай” праблем тэрыторыі. Разам з тым менавіта нашы магчымасці, моцныя бакі, мясцовыя рэсурсы ў самым шырокім іх разуменні могуць стаць важнай асновай для развіцця. Як справядліва пішуць Джон Кретцман і Джон Макнайт, “ўвесь гістарычны вопыт сведчыць, што значнае развіццё суполак магчыма толькі пры ўмове, што члены мясцовай абшчыны разумеюць неабходнасць інвеставаць свае рэсурсы менавіта ў развіццё. Адсюль зразумела, чаму абшчыны не развіваюцца зверху ці звонку...”[28]. А ў кітайцаў, кажуць, адным і тым жа іерогліфам пазначаюцца паняцці і “праблема”, і “магчымасць”. У кожным невялікім мястэчку ёсць шырокая палітра магчымасцяў, рэсурсаў, рэзерваў, канкрэтных аб'ектаў, якія могуць стаць асновай або дадаткам да “паліва” для мясцовага развіцця.



## 97. Нікога не пакінем збоку

Прыкладна так перакладаецца патрабаванне-абавязак з “Мэтаў ўстойлівага развіцця” (МУР), прынятых ААН у 2015 годзе ў рамках дакумента «Пераўтварэнне нашага свету: Парадак дня ў сферы ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года» (Парадак дня УР-2030).

Гаворка ідзе пра тое, што мы стараемся далучыць да агульных справаў усіх магчымых удзельнікаў – жанчын і мужчын, людзей з інваліднасцю і з асаблівымі патрэбамі, пажылых і моладзь, людзей розных прафесій, прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. Дзверы працы па ўстойлівым развіцці нашага мястэчка адчынены для ўсіх. Зручнасць такога ўдзелу мы павялічваем адкрытасцю інфармацыі, стварэннем безбар’ернага асяроддзя, развіццём магчымасцяў для мабільнасці.



## 98. Сацыяльныя прадпрыемствы

Ва ўсім свеце сацыяльныя прадпрыемствы – гэта менавіта мясцовая справа. Дзяржава толькі прымае агульны закон, які спрашчае працэдуры стварэння і развіцця такога бізнесу і зніжае ці адмяняе падаткі. Да стварэння спрыяльных умоў для сацыяльных прадпрыемстваў далучаюцца таксама мясцовыя ўлады, якія перадаюць ім у карыстанне будынкі і памяшканні, дапамагаюць з інфраструктурай. А далей – мы самі!

Сацыяльная эканоміка нашага мястэчка, гэта:

- Майстэрня па рамонце ровараў.
- Крамка "Зрабі сам".
- Міні-швейнае атэлье.
- Міні-кузня.
- Конны двор, дзе можна замовіць ад карэты для вясельнага картэжа…



## 99. Недзяржаўныя некамерцыйныя арганізацыі

Наяўнасць такіх арганізацый — як развіццё сферы паслуг у эканоміцы — паказвае ступень развіцця грамадства, узровень дэмакратызацыі і рэалізацыі прынцыпа субсідыярнасці. Ва многіх гарадках і вёсках развітых краін такіх арганізацый — дзесяткі і сотні. Яны створаны ініцыятывай аматараў музыкі і спорта, кветак і аховы прыроды. Рыцарскія і роварныя клубы, фонды, якія кіруюць музеямі і іншымі аб’ектамі культуры. Тут і ўстановы нефармальнай дадатковай адукацыі, і сацыяльныя цэнтры, і агенцтвы мясцовага развіцця. Людзі працуюць там то на сталай аснове, то ў вольны час. Гэта магчымасць выбраць справу па сэрцы, рабіць тое, што падабаецца, далучыцца да вырашэння важных задач. І адначасова — уносіць важкі ўклад у справу ўстойлівага развіцця свайго мястэчка.



## 100. Не губляць час, пачынаць дзейнічаць

Мы не чакаем, пакуль на нашы патрэбы звернуць увагу "наверсе" і нехта вырашыць нам дапамагчы. Мы пачынаем самі.

Ды й хваробу лепш папярэдзіць, чым лячыць. Часцей мы лепш ведаем пра пагрозы нашаму развіццю, чым нейдзе наверсе ва "ўладных структурах". Мы заўважаем невялікія змены, новыя тэндэнцыі, і мы самі даволі хутка можам распачаць нейкія дзеянні, каб прадухіліць негатыўнае развіццё падзей.

Мы пачынаем справу сваімі сіламі, а паралельна распрацоўваем праектныя прапановы, удзельнічаем у грантавых конкурсах.

Нашы ініцыятывы не застаюцца незаўважанымі, і нам прапануюць дапамогу, партнёрства. У выніку справа дзеля ўстойлівага развіцця мацнее.

Пажадаем і вам поспехаў на гэтым шляху!



Падзякі ад аўтара

Гэтая кніжка нарадзілася дзякуючы намаганням і ўдзелу многіх людзей. Па першае, гэта — мая сям’я: жонка Любоў і сыны Павел і Святаслаў. Я вельмі ўдзячны ім за цярпенне і падтрымку маёй працы. Мае настаўнікі — дактары эканамічных навук Ада Дзмітрыеўна Паўлава і Людміла Васільеўна Казлоўская — ўвялі мяне ў чароўны будынак навуковых даследванняў. Сябры і калегі на розных этапах майго жыцця давалі карысныя парады, дзяліліся ідэямі, падтрымлівалі і натхнялі. Сярод іх калегі па сумеснай працы ў Інстытуце эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міжнароднай фінансавай карпарацыі, аднадумцы з Праграмы падтрымкі Беларусі федэральным ўрадам Германіі, праектаў ПРААН, Еўразвяза, Міжнароднага грамадскага аб’яднання “Цэнтр устойлівага развіцця”, мясцовага фонда “Новая Еўразія”, Грамадскай платформы “Новая вёска” і іншых арганізацый і праектаў з розных гарадоў і вёсак Беларусі і іншых краін. Вольга Шулейка, Марына Маркусенка, Аліна Остлінг, Валерый Кліменка, Нікола Свон, Ірына Бугрова, Астрыд Зам, Анатоль Касьяненка, Анатоль Лысюк, Генадзь Цывінскі, Эдуард Вайцэховіч, Альберт Жлоба, Жана Філіпава, Міхаіл Хвесік – вялікі дзякуй! Я шчыра ўдзячны ўсім вам!

І прабачце, калі каго не згадаў.

Імпэту працаваць над гэтым выданнем дадалі ўдзел у Программе Community Connection «Развитие местных сообществ» (США, 2009), супрацоўніцтва з Еўрапейскім вясковым парламентам (European Rural Parliament) і Міжнароднай вясковай сеткай (International Rural Network). Прыклады, ідэі і гісторыі поспеху на шляху ўстойлівага развіцця мясцовых супольнасцяў я прывёз не толькі з розных куткоў Беларусі, а і з навуковых і навучальных вандровак – з Германіі і Вялікабрытаніі, Польшчы і Украіны, ЗША і Швецыі, Ізраіля і Харватыі, Аўстраліі і Фінляндыі… Дзякуй!

Знаёмства з таленавітай мастачкай Лізай Хуцкай дало магчымасць напоўніць кніжку выразнымі малюнкамі. Вялікі дзякуй, Ліза!

Выданне было падрыхтавана ў межах “Школы мэраў” – сумеснай праграмы АДУ “Цэнтр даследавання грамадскага кіравання “СІМПА” і грамадскай культурніцкай кампаніі “Будзьма беларусамі”. Асабістая падзяка акадэмічнаму дырэктару “СІМПА” Дзмітрыю Маркушэўскаму за парады.

Літаратура


1. Changing our city, changing ourselves: Nottingham's Local Agenda 21 plan.
2. European Rural Manifesto 2015. (http://europeanruralparliament.com/index.php/archive/erp-2015/european-rural-manifesto-2015).
3. Focus on Sustainable Development. Nordic Key Indicators 2006. – Nordic Council of Ministers, Copenhagen, 2006.
4. Friedman T.L. The world is flat. The globalized word in the twenty-first century. – Penguin Books Ltd, 80 Strand, London WC2R 0RL, England, 2006.
5. Local Agenda 21. Methodological Manual Based on Experiences from Slovakia / Edited by Peter Mederly. Bratislava: Regional Environmental Center for Central and Eastern Europe, April 2004.
6. Locale Agenda 21. Berlin zukunftstähig gestalten. – Abgeordnetenhaus Berlin, 2006.
7. Locale Agenda 21. Treptow-Köpenik. – Berlin, 2004.
8. Nachhaltigkeitsbericht Hochenheim. Indikatoren für Eine Locale Agenda. – 2003.
9. Our Community Our Future: A Gide to Local Agenda 21. – Canberra, 1999.
10. Sivagrakau Aleg. Principles of Sustainable Development // Сахаровские чтения 2015 года: экологические проблемы XXI века: Материалы 15-й междунар. науч. конф., 21-22 мая 2015г., г. Минск, Республика Беларусь. – Минск: МГЭУ им. А.Д. Сахарова, 2015. С. 45.
11. Strategic Challenges. A Further Elaboration of the Swedish Strategy for Sustainable Development. – Ministry of Sustainable Development. – Sweden, 2006.
12. Sustainability Indicators research Project. Report of phase one. Prepared for the UK Local Government Management Board Local Agenda 21 steering group by Touche Ross Management consultants, the New Economics Foundation and the United Nations Association. 1994. June.
13. Sustainable Development in Germany. Indicator Report 2006. – Federal Statistical Office of Germany, Wiesbaden, 2007.
14. Sustainable Development Indicators for Sweden – a first set 2001. – Statistics Sweden; Swedish Environmental Protection Agency, 2001 (www.scb.se ).
15. Sustainable Development Strategies. A Resource Book. / Complied by Barry Dalal-Clayton and Stephen Bass. – OECD, London – New York, 2002.
16. The Barcelona Agenda 21 Indicators (www.bcn.es/agenda21/english/A21_indicators_eng.htm).
17. The Non-profit Sector in a Changing Economy. – OECD, Paris, 2003 (ISBN 92-64-19953-5).
18. Urban Environmental Management / The Baltic University Programme. Case studies. Volume IV. — Uppsala, Sweden, 2003.

19. Аткиссон А. Как устойчивое развитие может изменить мир/А. Аткиссон; пер. с англ. — М.: БИНОМ. Лаборатория знаний, 2012. – 455 с.
20. Бабинцев В. Стратегия устойчивого развития региона и улучшение качества жизни населения/В. Бабинцев, А. Гармшев, Г. Ушамирская // Стандарты и качество. — 2003. №2.
21. Брест. Стратегия развития (2006). Под науч. ред. Желткова И.М. и Лысюка А.И. — Брест.
22. В интересах нынешнего и будущих поколений. Стратегия устойчивого развития города Новополоцка. — Местная повестка-21 (2010). Минск: Ковчег.
23. Вайцзеккер Э., Ловинс Э., Ловинс Л. Фактор четыре. Затрат — половина, отдача — двойная. Новый доклад Римскому клубу. Перевод А.П. Заварницына и В.Д. Новикова, под ред. академика Г.А.Месяца. — Москва: Academia, 2000.
24. Ветковский район Гомельской области. Стратегия устойчивого развития района (2010). Ветка – Минск: ИП «Альтиора – Живые краски».
25. Донелла Медоуз, Йорген Рандерс, Денис Медоуз. Пределы роста. 30 лет спустя. — Москва: ИКЦ Академкнига, 2007. — 342 с.
26. Концепция стратегии устойчивого развития города Лиды и Лидского района/Л.И. Мастюгин [и др.]. — Минск: Поликрафт, 2014. — 90 с.
27. Котлер Ф. Маркетинг мест / Ф. Котлер, К. Аспунд, И. Рейн, Д. Хайдер. — СПб.: Стокгольмская школа экономики, 2005.
28. Кретцман Джон П., Макнайт Джон Л. Создание общин за счет внутренних ресурсов. Путь к открытию и мобилизации внутренних ресурсов общины: Перевод с английского. – Киев: Четверта хвиля, 2006. — 262 с.
29. Кьелл А. Нордстрем и Йонас Риддерстрале. Бизнес в стиле фанк. Капитал пляшет под дудку таланта. / Пер. с англ. — Стокгольмская школа экономики в Санкт-Перербурге: СПб, 2002.
30. Медоуз Д.Х., Медоуз Д.Л., Рандерс Й. За пределами роста: Пер. с англ. — Москва: Издательская группа «Прогресс», «Пангея», 1994. — 394 с.
31. Местная Агенда 21 / Публикация SEI № 3. Составители Юлле Вахт, Пирет Кулдна, Ахто Оя. — Таллинн, 2001.
32. Местные органы власти и права человека: оказание эффективных услуг / Международный совет по политике в области прав человека. — Швейцария, 2005.
33. Методическое пособие по разработке стратегий устойчивого развития районов и городов областного подчинения в Республике Беларусь / Руководители проекта: В. Пинигин (НИЭИ), Клаус Ройтер (LAG 21 NRW). Авторы: Пинигин В., Берченко Н. и др. – Минск, 2015. – 72 с.
34. Методология разработки и реализации стратегий устойчивого развития территорий (местных повесток-21) / О.В. Сивограков, А.И. Лысюк, А.П. Касьяненко, В.Е. Левкевич. Под ред. О.В. Сивогракова. — Минск: ПРООН / Ковчег, 2010. — 168 с.

35. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 года. — Минск: Юнипак, 2004.
36. Наше общее будущее. Доклад Международной комиссии по окружающей среде и развитию (МЛЩСР). — Москва: Прогресс, 1989.
37. От теории к практике: Реализация концепции устойчивого развития / Устойчивое развитие Балтийского региона. Книга 10. — Программа Балтийского университета. Уппсала – Минск, 2000.
38. Партнерство в устойчивом развитии местных сообществ: опыт, возможности, перспективы (Материалы научно-практической конференции. Минск, 16 – 18 апреля 2004 г.). — Минск, 2004.
39. Повестка дня на XXI век. Конференция Организации Объединенных Наций по окружающей среде и развитию в Рио-де-Жанейро, 1992. – Москва: Социально-экологический Союз при поддержке Фонда Дж. Д. и К. МакАртуров, 2000. – 218 с.
40. Правовые основы устойчивого развития на местном уровне/Т.И. Макарова [и др.]. — Минск: Программа развития ООН / Ковчег, 2010. — 56 с.
41. Пчелинцев О.С. Региональная экономика в системе устойчивого развития. — Москва, Наука, 2004. — 258 с.
42. Сборник материалов о местных инициативах граждан и общественных объединений / Д. Маркушевский [и др.]. — Минск, СИМПА, 2017. — 24 с. (http://sympa-by.eu/sites/default/files/library/local_inits_web.pdf)
43. Сівагракаў А.У. Устойлівае развіццё вясковых тэрыторый Беларусі: патэнцыял самаразвіцця // Проблемы устойчивого развития регионов Республики Беларусь и сопредельных стран : Сб. науч. статей VI Междунар. науч.-практ. интернет-конф., 1 февраля – 31 марта 2017 г., г. Могилев / под ред. И.Н. Шарухо, А.Н. Пахоменко. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2018. – 224 с. (с. 8-13).) https://yadi.sk/i/C1VNHfRN6s7w6g )
44. Сіваграков О. Дорогу здолае той, хто йде! — Львів, 2015 (на украинском языке).
45. Сивограков О.В. Сельское развитие: традиции + инновации + стратегия = устойчивость. Методическое пособие по разработке стратегии устойчивого развития сельской территории. — Минск: Новая Евразия, 2017. — 52 с. (http://www.eurasia.by/old_site/upload/%CC%E5%F2%EE%E4%E8%F7%EA%E0%20%F1%F2%F0%E0%F2%E5%E3%E8%E8.pdf)
46. Сивограков О.В. Сельские сообщества: потенциал саморазвития. — Минск: Новая Евразия, 2017. — 95 с. (в соавторстве). (http://eurasia.by/old_site/upload/ Сельские%20сообщества.pdf)
47. Сивограков О.В. Думаем глобально, действуем локально. Стратегии устойчивого развития – Местные повестки на XXI век в Беларуси. — Минск: Пропилеи, 2007.

48. Сивограков О.В. Индикаторы устойчивого развития местного сообщества (Как оценить результаты Местной повестки-21). — Минск: Пропилеи, 2008.
49. Сивограков О.В. Местная повестка-21 как инструмент устойчивого развития территорий. — Минск: Программа развития ООН, 2009.
50. Социально-экономический потенциал устойчивого развития. Учебник. Под ред. Л.Г.Мельника и Л.Хенса. – Сумы: Университетская книга, 2007.
51. Стратегия устойчивого развития — Местная повестка-21 Желудокского края. Отчет о прогрессе, дополнения и уточнения (по состоянию на январь 2014 г.) / Г.И. Цивинский [и др.]. — Минск: Поликрафт, 2014. — 42 с.
52. Стратегия устойчивого развития Беларуси: преемственность и обновление. — Минск, 2003. С.21.
53. Стратегия устойчивого развития Видомлянского сельского Совета (2013). Под ред. Демянчика В.Т. Брест : Альтернатива.
54. Стратегия устойчивого развития города Барань / В.А. Русаков [и др.]. — Минск: Поликрафт, 2014. — 42 с.
55. Стратегия устойчивого развития Дисненского края. – Минск, Юнипак, 2005.
56. Стратегия устойчивого развития Желудокского края – Местная повестка-21 (2010). — Минск: Ковчег.
57. Укрепление общественного взаимодействия для устойчивого развития сельских регионов Беларуси. — Минск: Новая Евразия, 2014. 43 с.
58. Устойчивое развитие на местном уровне: Местная повестка дня на 21-й век / Э.Г. Иванова, Ю.В. Яблонская. — Минск, 2007.
59. Чаусы — место, куда хочется вернуться (Местная повестка на XXI век для города Чаусы и Чаусского района)(2010).–Минск: Ковчег.
60. Чаусы — место, куда хочется вернуться. Местная повестка на XXI век для города Чаусы и Чаусского района. Дополнение к основному тексту. Концепция развития жилищной сферы, энергосбережения и энергоэффективности / А.О. Матюлин [и др.]. — Минск: Поликрафт, 2014. — 31 с.
61. Школа + деревня: вместе к устойчивому развитию (Местная повестка-21 деревни Здитово Споровского сельского совета) (2010). Здитово — Минск: ИП «Альтиора — Живые краски».
62. Школьная Местная повестка-21: пособие для общеобразовательной средней школы. — Минск: Академия последипломного образования, 2008.
63. Школьные местные повестки: первые шаги в Беларуси. — Минск: ММОЦ им. Й. Рау, 2008.

---

Больш матэрыялаў у бібліятэцы СІМПА: http://sympa-by.eu/ru/library